Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 МАЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 95 (27953) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Што сказала «галава Сакрата»

СТАР. 4

Вядучы тэленавін — пра жыццё за кадрам

СТАР. 5

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

КВЕЦЕНЬ НА ДВАІХ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра:

«Камунальныя службы павінны не толькі своечасова інфармаваць гараджан аб правядзенні ў іх доме капітальнага рамонту, але і абавязкова паведамляць жыльцам пра тое, якія віды работ будуць выкананы, паказваць ім адпаведную дакументацыю. Індывідуальным павінен быць падыход да тых, хто не ў стане выканаць за кошт уласных сродкаў віды работ, якія выключылі з пераліку капрамонту. Думаю, людзям, якія маюць невялікі даход, пенсіянерам, інвалідам, у гэтым выпадку можна прапанаваць растэрміноўку ці аказаць адрасную сацыяльную дапамогу».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.05.2015 г.

Долар ЗША	14380,00 ▲
Еўра	15980,00 ▲
Рас. руб.	288,50 ▲
Укр. грыўня	693,01 ▲

ISSN 1990 - 763X

УВАГА, «ПРАМАЯ ЛІНІЯ»!

Чаго чакаць на рынку нерухомасці сёлета?

Ці варта менавіта цяпер прадаваць кватэру альбо лепей пачакаць? Што набыць — кватэру ў горадзе ці дом у раёне? Дзе лепш выбраць зямельны ўчастак? Ці будзе расці або зніжацца кошт жыллёвай арэнды? На гэтыя і іншыя пытанні **25 мая з 13.00 да 14.00** падчас «прамой лініі» ў рэдакцыі газеты «Звязда» адкажа **дырэктар агенцтва нерухомасці «Цэнтрастыль» Вячаслаў ЗАЎГАРОДНІ.**

Задаваць пытанні падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефоне: 8 (017) 287 18 71. Папярэднія пытанні дасылайце на электронны адрас рэдакцыі (info@zvyazda.minsk.by) або задавайце па тэлефонах: 8 (017) 292 38 02 ці 8 (017) 287 17 51.

Шматаблічная краіна

Краіна, у якой, акрамя беларускага народа, пражываюць прадстаўнікі больш чым 140 нацыянальнасцей. У якой традыцыйныя хрысціянскія каштоўнасці праяўляюцца праз дабрыню і гасціннасць, а таксама цярпімасць да носьбітаў іншых веравызнанняў. Пра гэта пойдзе размова на прамой лініі **Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Леаніда ГУЛЯКІ,** якая адбудзецца ў рэдакцыі «Звязды» **26 мая ў 11 гадзін.** Пытанні можна задаць асабіста ў дзень «прамой лініі» па тэлефонах у Мінску: 287 18 71, 287 18 66. Папярэдне: у лістах на адрас рэдакцыі, па тэлефоне 287 18 69 ці па электроннай пошце info@zvyazda.minsk.by (з пазнакай «На прамую лінію»).

Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гімназія №56 г. Мінска»
з рускай мовай навучання
АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР НАВУЧЭНЦАЎ У 5-Я КЛАСЫ
Залічэнне ў гімназію ажыццяўляецца на конкурснай аснове пасля правядзення ўступных іспытаў.
Адметныя асаблівасці гімназіі:
- якасная адукацыя;
- высокапрафесійны педагагічны калектыў;
- высокія вынікі навучэнцаў у алімпіядным руху, у конкурсах навукова-даследчых прац;
- 98% выпускнікоў паступаюць у ВНУ;
- вывучэнне на паглыбленым узроўні замежных (англійскай, нямецкай) моў, фізікі, матэматыкі, хіміі, біялогіі.
Нам 30 гадоў!
вул. Варанянскага, 11, к. 2, 220039, г. Мінск
E-mail: gymn56@minsk.edu.by
(017) 220-54-15
Упраўленне адукацыі, спорту і турызму адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Мінска . УНП 190743329

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2015 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.
Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

АШЧАДНА І ПА-ГАСПАДАРСКУ

Прэзідэнт патрабуе ідэальнага парадку на зямлі

Такую задачу Аляксандр Лукашэнка паставіў на нарадзе па ўдасканаленні заканадаўства аб ахове і выкарыстанні зямель, паведамляе БЕЛТА.

На разгляд кіраўніка дзяржавы прадстаўлены праект указа, якім прапануецца ўнесці змены ў заканадаўства аб адабранні і прадастаўленні зямельных участкаў.

«Мае адносіны да зямель, асабліва сельгаспрызначэння, ды і лясного фонду, вы ведаеце. Сёння ніякіх мерапрыемстваў у плане будаўніцтва і гэтак далей, звязаных з адвядзеннем зямель, без дазволу Прэзідэнта ў краіне не праводзіцца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што ў свой час у Беларусі былі дадзены паўнамоцтвы губернатарам распараджацца гэтымі землямі, аднак затым парадак быў зменены. «Чаму гэта адбылося, я казаў. Такога хаосу і непарадку на зямлі, як у той перыяд, у нас не было! Пачалі будаваць на ўрадлівых землях розныя склады, прадпрыемствы, ды і жыллё», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Землі сельгаспрызначэння — гэта святое. Многія пакаленні іх стваралі, высякаючы дрэвы, займаючыся лядным земляробствам, ствараючы тое, што корміць народ, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Зямельныя рэсурсы — гэта найвялікшая каштоўнасць для любой дзяржавы. Адсюль маё стаўленне да гэтага».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што перш, чым падпісваць адпаведны ўказ, хацеў бы абмеркаваць пытанне рацыянальнага выкарыстання зямельных рэсурсаў. «Гэта наша багацце. 90 працэнтаў тэрыторыі краіны — гэта землі сельгаспрызначэння і лясы, якія павінны выкарыстоўвацца эфектыўна», — сказаў ён.

Прэзідэнт пацікавіўся ў прысутных, чым выклікана неабходнасць карэкціроўкі існуючага парадку, што новага прапануецца ў плане ўдасканалення выкарыстання зямельных рэсурсаў і як гэта павысіць эфектыўнасць гаспадарання ў гэтай сферы.

«Пры гэтым хачу заўважыць: на зямлі павінен быць ідэальны парадак. Гэта наш брэнд, наш твар. Хто б у краіну ні прыязджаў, адзначае нашу гармонію з прыродай, што мы яе не сапсавалі, што чалавек у нашай краіне можа і адпачываць, і жыць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Чысціня — гэта і паветра, і зямельныя рэсурсы, лес — гэта здароўе нашага чалавека. Таму я надаю такую пільную ўвагу землям сельгаспрызначэння і лясным рэсурсам. І далей мае патрабаванні будуць толькі станавіцца больш жорсткімі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

На нарадзе разглядаўся інструментарый эканамічнага прымусу да павышэння эфектыўнасці выкарыстання зямель. У прыватнасці, прапануецца ўнесці адпаведныя змены ў падатковае заканадаўства.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што многія грамадзяне, індывідуальныя забудоўшчыкі, дачныя кааператывы просяць новыя ўчасткі зямель, да якіх потым неабходна падводзіць інфраструктуру і камунікацыі. У той жа час у вёсках шмат участкаў пустуе.

Прэзідэнту таксама ўнесена прапанова, якая тычыцца абароны правоў грамадзян ад нядобрасумленных забудоўшчыкаў. У прыватнасці, прапануецца ў выпадку, калі нядобрасумленны забудоўшчык не выканаў сваіх абавязацельстваў, зямельны ўчастак не выстаўляць паўторна на аўкцыён. Тым самым не адбудзецца падаражання будаўніцтва, участак аператыўна перадаецца іншаму забудоўшчыку, і людзі атрымліваюць жыллё за ранейшы кошт.

Акрамя таго, прапануецца ўскласці на мясцовыя органы ўлады рашэнне некаторых пытанняў, звязаных з абаронай правоў пэўных катэгорый грамадзян.

Прэзідэнт даручыў дапрацаваць змены ў заканадаўства аб ахове і выкарыстанні зямель з улікам праведзенага абмеркавання.

Прамая лінія МУС

У суботу (23 мая) адбудзецца прамая тэлефонная лінія з Валянцінам Уладзіміравічам Міхневічам, часовым выканаўцам абавязкаў міністра ўнутраных спраў. Пытанні, якія тычацца барацьбы са злачыннасцю і карупцыяй, забеспячэння асабістай і маёмаснай бяспекі грамадзян, можна задаць з 9.00 да 12.00 гадзін па тэлефоне (8017) 218-55-30.

■ Блізкая ўлада

Ініцыятывам патрэбна падтрымка

У тым ліку — матэрыяльная

Выязное пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу краіны пройдзе на наступным тыдні ў Бярозаўскім раёне.

Сенатары маюць намер разгледзець пытанне «Аб рабоце мясцовых Саветаў Брэсцкай вобласці па забеспячэнні ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця падведамаснай тэрыторыі». Удзельнікі мерапрыемства абмяркуюць асаблівасці фарміравання мясцовых бюджэтаў, работу органаў мясцовага кіравання і самакіравання па стварэнні новых рабочых месцаў і прыцягненні ў гаспадарчы абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца; праблемы занятасці насельніцтва, а таксама іншыя пытанні.

Кожнаму з кіраўнікоў мясцовых Саветаў ёсць што сказаць з нагоды пералічаных пытанняў. Сваімі думкамі некаторыя з іх падзяліліся з нашым карэспандэнтам.

Сяргей АШМЯНЦАЎ, старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў:

— Мы ўжо даўно прыйшлі да высновы, што жыццёва важныя пытанні, якія датычаць работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аховы здароўя, транспарту, бытавога і гандлёвага абслугоўвання, трэба разглядаць менавіта з выездам на месца — на выязных сесіях, прэзідыумах, пасяджэннях пастаянных камісій. Пры гэтым дэпутаты сустракаюцца з насельніцтвам, абмяркоўваюць надзённыя праблемы з працоўнымі і пенсіянерамі. Потым тыя ж пытанні ўзнімаюцца ўжо на іншым узроўні — у гутарках са старастамі вёсак, дэпутатамі мясцовых Саветаў, прадстаўнікамі органаў тэрытарыяльнага самакіравання. Такая работа дазваляе кожнаму дэпутату паспрыяць выпрацоўцы правільнага рашэння, а таксама паглядзець, як рэалізуюцца раней прынятыя праграмы і рашэнні, параўнаць падыходы органаў улады ў сваім рэгіёне з суседнімі, заўважыць нешта новае.

Дарэчы, старшыні сельскіх і пасялковых Саветаў традыцыйна запрашаюцца на сесіі аблсавета, якія разглядаюць пытанні выканання прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і бюджэту вобласці і зацвярджаюць прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця і бюджэту на чарговы год. Кожны можа ўзяць слова і выказаць сваю думку. Асаблівую задачу органы мясцовага самакіравання бачаць у рабоце з насельніцтвам па месцы жыхарства, спрыяюць умацаванню працоўнай дысцыпліны, а таксама навядзенню парадку ў гарадах і сельскіх населеных пунктах.

Аляксандр СЕЛІФОНТАЎ, старшыня Баранавіцкага гарадскога Савета дэпутатаў:

— Літаральна тры дні таму вопыт нашага камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Надзея» вывучалі спецыялісты з Брэста і Пінска. «Надзею» ўтварыла група энтузіястаў ва ўсходнім мікрараёне горада. Сёння камітэт аб'ядноўвае 25 дамоў, у якіх пражывае каля 5 тысяч чалавек. Названая структура мае свой рахунак у банку, на які паступаюць грошы, сабраныя жыльцамі, і іншыя сродкі. Напрыклад, «Надзея» атрымала невялікі грант ад Сусветнага банка развіцця. Дык вось, за час існавання камітэта знешні выгляд дамоў, пад'ездаў, двароў, якія ўвайшлі ў суполку, істотна памяняўся. Удалося не проста навесці чысціню, прыгажосць у шматкватэрных дамах, але і навучыцца яе падтрымліваць. Самі людзі цяпер за гэтым уважліва сочаць.

Па прыкладзе «Надзеі» ў Баранавічах утвораны яшчэ чатыры падобныя камітэты. Відавочна, што справа гэта перспектыўная. Там, дзе знойдзецца група энтузіястаў-аднадумцаў, можна пераканаць жыхароў далучыцца да агульнага ўдзелу ў навядзенні парадку. Але відавочна і другое: настаў час знайсці законныя рычагі падтрымкі такой вось народнай ініцыятывы. Камітэтам грамадскага самакіравання трэба дапамагаць матэрыяльна. Сабралі людзі грошы, адрамантавалі пад'езд, сваімі сіламі ўпрыгожылі двор, разбілі клумбы, пабудавалі дзіцячыя пляцоўкі... Далей жа абавязкова паўстане пытанне аб ямачным рамонце дарогі насупраць дома, іншых капіталаёмкіх мерапрыемствах, якія грамадскай суполцы не пад сілу. І тут важна, каб падключаўся горад, каб людзі адчувалі сустрэчны рух. Неабходна, каб падтрымка была не толькі эпізадычнай, як гэта здараецца цяпер, калі камітэту тэрытарыяльнага самакіравання дапамагалі правесці зварачныя альбо іншыя работы, а мела пастаянны ўстойлівы характар на законнай аснове.

Мікалай ЧЫЖ, старшыня Бярозаўскага раённага Савета дэпутатаў:

— Адзін час нават абмяркоўвалася пытанне аб тым, ці патрэбны наогул дэпутаты сельскіх Саветаў. Дык вось, паводле майго глыбокага пераканання, трэба не толькі іх выбіраць, але і ўсяляк падтрымліваць, павышаць іх статус. Добра, што цяпер гэтым дэпутатам далі магчымасць адзін дзень у месяц атрымліваць вызваленне ад асноўнай работы і працаваць у сваіх акругах. Патлумачу на прыкладзе. У нас аб'ядналі былыя Боркаўскі і Сігневіцкі сельсаветы. Цяпер у аб'яднаную адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку ўваходзіць 20 вёсак. У палове населеных пунктаў пражывае не больш за 50 чалавек. Старшыня сельскага Савета можа аб'ехаць усе вёскі, скажам, раз на месяц у лепшым выпадку. А калі дэпутат, умоўна кажучы, настаўніца Марыя Пятроўна, хаця б на некалькі хвілін зойдзе да кожнага, асабліва пажылога, чалавека з маленькай вёсачкі, пацікавіцца справамі, клопатамі, праблемамі, такі візіт стане падзеяй для вяскоўца. Ён не будзе адчуваць сябе пакінутым, забытым. Вось гэта і ёсць работа з насельніцтвам, пра якую мы гаворым на кожнай сваёй сесіі.

І яшчэ адзін прыклад. За апошнія два гады насельніцтва раёна сабрала 334 мільёны рублёў уласных сродкаў на добраўпарадкаванне могілак. У названым кірунку зроблена вялікая работа. У кампаніі па зборы грошай цяжка пераацаніць ролю дэпутатаў менавіта пярвічнага ўзроўню.

Іван ДАЎЖУК, старшыня Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў:

— З усяго шырокага спектра работы мясцовых Саветаў я хацеў бы выдзеліць клопат дэпутатаў аб навядзенні парадку ў райцэнтры і вёсках. У Кобрыне не першы год існуе адпрацаваная схема, якая, на маю думку, дае станоўчыя вынікі. Па месцы жыхарства створаны дваровыя камітэты, якія праводзяць суботнікі, нядзельнікі добраўпарадкавання. Справу падтрымліваюць і працоўныя калектывы, калі ўпрыгожваюць тэрыторыю вакол прадпрыемстваў і побач з імі. У нас праходзяць рэгулярныя гарадскія конкурсы-агляды на самае лепшае ўтрыманне тэрыторый, пераможцы заахвочваюцца. І Кобрын сёння выглядае па-сучаснаму, нам не сорамна прымаць гасцей з любых гарадоў і краін.

А ў вёсках дзейнічаем у асноўным праз сельскія сходы. На сходы стараюся выязджаць як найчасцей. Пасля такіх сходаў наведзены парадак на многіх могілках. Людзі не толькі дапамагалі сваім удзелам, напрыклад, у расчыстцы ад лішняй расліннасці, але і збіралі грошы на агароджу, на фарбу, на аплату тэхнікі. Практыка сходаў паказала, што вельмі важна правільна правесці тлумачальную работу, пераканаць людзей у неабходнасці ўдзелу кожнага ў агульнай справе.

Валерый ГЕРМАН, старшыня Жамчужненскага сельскага Савета дэпутатаў Баранавіцкага раёна:

— Сёння асаблівую актуальнасць набывае ўменне падтрымаць ініцыятыву людзей і падштурхнуць грамадскую свядомасць да добрай ініцыятывы. Напрыклад, у пасёлку Жамчужны людзі гадамі складвалі бытавыя адходы ля хлявоў. І хоць смецце не звальвалася ў кучу — жыхары складвалі яго ў мяхах, але не вельмі эстэтычна ўсё гэта выглядала. Мы пагаварылі з людзьмі, пасля чаго ўладальнікі падсобных памяшканняў сабралі грошы і залілі кантэйнерную пляцоўку. Цяпер там стаяць кантэйнеры, смецце рэгулярна вывозіцца, і не ўзнікае пытанняў ні ў санітарнай, ні ў прыродаахоўнай службаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■ Парламенцкі дзённік

НАША ТЭХНІКА ДЛЯ М'ЯНМЫ

«Супрацоўніцтва з Саюзам М'янма мы разглядаем у якасці важнага кірунку знешняй палітыкі ў Паўднёва-Усходняй Азіі», — адзначыў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч падчас сустрэчы са старшынёй Палаты нацыянальнасцяў Саюзнага сходу Рэспублікі Саюз М'янма Хін Аунг М'інтам. На працягу чатырох дзён парламенцкая дэлегацыя М'янмы будзе знаходзіцца з афіцыйным візітам у нашай краіне.

«Мы зацікаўлены ў пашырэнні палітычных і гандлёва-эканамічных кантактаў. І, безумоўна, гэта датычыцца і перспектывы развіцця стасункаў у адукацыйнай і навукова-тэхнічнай сферы», — паведаміў беларускі парламентарый.

Сенатар зрабіў акцэнт на тым, што перамовы мелі «канструктыўны і змястоўны характар». «Мы ў асноўным надалі ўвагу двум напрамкам супрацоўніцтва: парламенцкаму і гандлёва-эканамічнаму». Спікер верхняй палаты парламента Беларусі заўважыў, што ў апошнія гады таваразварот паміж

Фота БЕЛТА.

нашымі дзяржавамі павялічыўся і расце даволі хутка.

«Мы адкрываем рынкі. Даволі паспяхова, але і не без праблем. Таму пытанні падыходаў па паляпшэнні гандлёва-эканамічных адносін, стварэнні суадноснай дагаворна-прававой базы зараз вырашаюцца. Мы дамовіліся, што парламент гэтаму будзе ўсебакова спрыяць. У тым ліку і камфорту працы кампаній на рынках нашых дзяржаў», — падвёў вынікі перамоў Міхаіл Мясніковіч.

У ходзе сустрэчы бакі дамовіліся і аб гуманітарным супрацоўніцтве. Было вырашана наладзіць прамы кантакт паміж універсітэтамі, у межах якога плануецца праводзіць навучанне грамадзян М'янмы ў беларускіх ВНУ для далейшай працы ў сельскай гаспадарцы.

Што датычыцца гандлёва-эканамічнай сферы, то Беларусь разлічвае на развіццё ўзаемных кантактаў у сельскай гаспадарцы і сельгаспадарчым машынабудаванні. Бакамі былі выказаны канкрэтныя прапановы для таго, каб кампаніям краін было як мага прасцей працаваць у гэтых сектарах.

Вераніка ПУСТАВІТ

■ З нагоды

«Нават прыходзяць па параду: нараджаць або не»

Дэпутаты пра ролю прафсаюзаў і прафсаюзнага лідара

Учора ўскладаннем вянкоў да Кургана Славы распачаліся мерапрыемствы VII з'езда Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. На форум прыбылі 500 дэлегатаў з усіх рэгіёнаў краіны і замежныя госці. Па словах старшыні ФПБ Міхаіла ОРДЫ, Курган Славы выбраны для старту невыпадкова: гэта помнік, які будаваўся сіламі ўсяго народа і ў год 70-годдзя Вялікай Перамогі быў рэканструяваны па ініцыятыве федэрацыі. У першы дзень форуму «Звязда» звязалася з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, якія прыйшлі ў парламент з прафсаюзных арганізацый. Нас цікавіў іх погляд на ролю прафсаюзаў у сучасным жыцці беларускага грамадства.

Ігар СТАНКЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях:

— Прафсаюзныя арганізацыі павінны быць. Яны з'яўляюцца «лакмусавай паперай» таго, што адбываецца ў той або іншай арганізацыі, на прадпрыемстве. Прафесійны саюз акумулюе ўсё, пачынаючы ад эканамічных пытанняў прадпрыемства і заканчваючы абаронай сацыяльных інтарэсаў членаў прафсаюза. Самым галоўным дакументам, які рэгулюе ўзаемаадносіны паміж наймальнікам і работнікам, з'яўляецца калектыўны дагавор. Яго можна назваць канстытуцыяй прадпрыемства. У ім прапісаны сацыяльныя льготы, абарона правоў работнікаў, планы развіцця прадпрыемства. Пры гэтым важна разумець, што сутнасць любога калектыўнага дагавора ў паляпшэнні артыкулаў Працоўнага кодэкса, пагаршэнне тут недапушчальнае. Дагавор гэты абавязкова ўзгадняецца з членамі прафсаюзнага камітэта. Такім чынам прафесійны саюз уплывае на прыняцце рашэнняў у арганізацыі, паляпшэнні ўмоў працы, яе аплаты.

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі — магутная арганізацыя, у ёй сёння налічваецца каля 4 мільёнаў членаў, і яе ролю ў абароне інтарэсаў работнікаў нельга недаацэньваць.

— Сяргей Веньямінавіч, да абрання ў парламент вы ўзначальвалі прафкам на ліцейным заводзе. Наколькі складана быць прафсаюзным лідарам у такім калектыве? — спыталі мы ў Сяргея ДУДКІНА, члена Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарту і сувязі:

— Рабочыя на заводзе — людзі простыя і шчырыя. Працаваць з імі і лёгка, і складана. Трэба ўмець размаўляць з імі на адной мове. І заўсёды казаць праўду. Рабочы чалавек не пацерпіць крывадушнасці і абыякавасці. Мне было лягчэй, бо сам адпрацаваў 10 гадоў на МАЗе фармоўшчыкам. У такіх працоўных калектывах прафсаюзны лідар больш навідавоку. Там немагчыма хітраваць...

— З чым у прафкам на заводзе прыходзяць людзі?

— З самымі рознымі праблемамі. Часцей за ўсё — вытворчымі, па аплаце працы, расцэнках, тэхніцы бяспекі. Бытавых праблем таксама хапае. Прыходзяць і з пытаннямі, вырашэнне якіх не ўваходзіць у кампетэнцыю старшыні прафсаюзнага камітэта, тым не менш я ніколі не адмаўляў. Займаўся і дапамагай у арганізацыі пахаванняў, прычым не толькі супрацоўнікаў завода, але і іх сваякоў. Жонкі скардзяцца на мужоў... Нават прыходзілі па параду: нараджаць або не, выходзіць замуж або не...

— Раілі нараджаць?

— Вядома! Чалавек жа не прыходзіць проста так, яго вымушае да гэтага складаная жыццёвая сітуацыя, патрэба ў падтрымцы. Работа старшыні прафкама — гэта яшчэ і псіхалагічная дапамога членам калектыву. У рабоце прафсаюзаў шмат руціннай работы: арганізацыя экскурсій, спартыўных мерапрыемстваў. Але не мае рацыі той, хто кажа, што роля прафсаюзаў абмяжоўваецца раздачай падарункаў і арганізацыяй карпаратыўных свят. Тым не менш і гэта някепска, нехта павінен і гэта рабіць.

— Ведаю, што ў нашых ІТ-фірмах арганізацыі карпаратыўных мерапрыемстваў надаецца шмат увагі...

— Так, для забеспячэння здаровай атмасферы ў калектыве гэта важна. Але я лічу, што нашым прыватным фірмам таксама неабходны прафсаюзы. Падчас сустрэчы з выбаршчыкамі нярэдка чую пра парушэнні працоўнага заканадаўства з боку наймальнікаў у камерцыйных прадпрыемствах. Напрыклад, супрацоўнікам фірмы не аддаюць працоўныя кніжкі ў дзень звальнення, не залічваюць работу ў працоўны стаж, не выплачваюць абяцаныя прэміі, затрымліваюць заробак... Быў бы там прафсаюзны лідар, думаю, гэтага б не было, бо свядома ніводны наймальнік парушаць закон не стане.

— Лічыце, што прафсаюзы не страцілі сваёй значнасці?

— Не страцілі. Грамадства змяняецца, і рэфармавацца прафсаюзы будуць, але яны не знікнуць. Проста трэба працаваць. Дарэчы, зараз сярод кіраўнікоў прафсаюзаў нямала маладых людзей.

— А што вы думаеце наконт аўтаномнай работы прафсаюзаў?

— Не трэба незалежнасць разумець як здольнасць ставіць перашкоды для наймальніка, бо сэнсу ў гэтым няма. Калі крытыкуюць, не прапануючы спосабы паляпшэння сітуацыі, то плёну няма. Прафсаюз павінен супрацоўнічаць з працадаўцам.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

■ Факт

НЕ ВЯРНУЛІСЯ З ЗАДАННЯ

У Магілёве ўвекавечылі памяць загінуўшых міліцыянераў.

На 4 гранітных плітах 124 прозвішчы супрацоўнікаў міліцыі Магілёўскай вобласці, жыццё якіх абарвалася падчас выканання службовага і воінскага абавязку ў перыяд з 1917 года і да цяперашняга часу. Дэкаратыўна-мастацкая кампазіцыя «Знамя памяці» створана і ўсталявана на добраахвотныя ахвяраванні асабістага складу і ветэранаў органаў унутраных спраў вобласці.

— Мы нізка схіляем галовы перад таварышамі, якія мужна стаялі на абароне закона, — адзначыў падчас цырымоніі яе ўрачыстага адкрыцця начальнік УУС Магілёўскага аблвыканкама Аляксандр Кавальчук. — Гэта не толькі даніна іх памяці, але і напамін усім тым, хто стаў прадаўжальнікам слаўных традыцый старэйшых пакаленняў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПРЭМІЯ ІМЯ ВІТАЛЯ КРАМКО

У Гродзенскім раёне ўжо склалася добрая традыцыя: лепшых вучняў узнагароджваюць прэміяй райвыканкама імя Героя Беларусі Віталя Ільіча Крамко.

Гэтай прэміяй (у памеры 10 базавых велічынь) заахвочваюць навучэнцаў, якія вызначыліся на алімпіядах, конкурсах, канферэнцыях і турнірах абласнога ўзроўню. Сёлета лаўрэатамі сталі 15 хлопчыкаў і дзяўчатак, сярод якіх 5 прызёраў абласнога этапу прадметных алімпіяд і 10 — абласнога конкурсу даследчых работ «Хрустальная Альфа». Іх узнагародзяць на ўрачыстых лінейках з нагоды заканчэння навучальнага года. Прычым для Таццяны Гапонік (Азёрская СШ) і Алега Буйноўскага (Путрышкаўская СШ) гэтая прэмія ўжо не першая. Акрамя таго, трое навучэнцаў за поспехі ў вучобе, спорце і грамадскім жыцці ўдастоены стыпендый раённага камітэта БРСМ у памеры пяці базавых велічынь.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ХУТКАСЦЬ БУДЗЕ НА КАНТРОЛІ

З 20 па 31 мая сталічная Дзяржаўтаінспекцыя праводзіць аперацыю «Хуткасць».

— Дарожная міліцыя максімальна ўзмоцніць кантроль за захаваннем удзельнікамі дарожнага руху ўстаноўленых хуткасных рэжымаў. У цэнтры ўвагі інспектараў апынуцца ўсе магістральныя вуліцы горада. Штодзённа з дапамогай сучасных тэхнічных сродкаў нарады ДПС будуць фіксаваць хуткасць аўтамабіляў, — сказала старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС горада Мінска Таццяна Спадабаева. — Дарэчы, за чатыры месяцы па прычыне перавышэння хуткасных рэжымаў у сталіцы адбылося 16 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх два чалавекі загінулі і 21 атрымаў раненні. Дзякуючы ўкараненню адзінай сістэмы фотафіксацыі парушэнняў хуткасці на сталічных дарогах удалося знізіць колькасць аварый. Так, летась за той жа перыяд было зафіксавана 21 ДТЗ, у якіх загінула пяць чалавек.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ А не шкодзь!

ДРОБНАЯ РЫБКА — БУЙНЫ ШТРАФ

Каля 320 мільёнаў рублёў давядзецца выплаціць электрабраканьерам, якіх затрымалі на тэрыторыі Кармянскага раёна. Тройца рыбачыла на рацэ Касалянцы ў зоне адсялення, дзе рыбалоўства ўвогуле забаронена. Ва ўлове ў іх была толькі дробная рыба, але колькасцю — больш за 200 штук.

— Работнікі Кармянскай міжрайінспекцыі разам з міліцыянерамі мясцовага РАУС затрымалі «рыбакоў» паблізу вёскі Залатоміна, калі тыя ехалі на калёсах. Мужчыны мелі пры сабе дзве акумулятарныя батарэі, узмацняльнік току, сачок, правады, гумавую лодку, — расказала прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Заўважыўшы службовы транспарт, парушальнікі выкінулі ў траву мех з рыбай і лодку, а таксама незарэгістраваную паляўнічую зброю. Відавочна, аматары незаконнай рыбалкі збіраліся яшчэ і папаляваць. Вырашаецца пытанне крымінальнай адказнасці затрыманых за незаконную здабычу рыбы, якая пацягнула нанясенне шкоды прыродзе ў памеры 1 787 базавых велічынь, і за незаконнае паляванне на тэрыторыі з радыяцыйным забруджваннем.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

ЗАХРАС... У СМЕЦЦЕПРАВОДЗЕ

Гэтая незвычайная гісторыя адбылася ў сталіцы. Выратавальнікам давялося даставаць з шахты смеццепровода мужчыну.

Выклік ім паступіў каля сямі гадзін ранку са шматкватэрнага дома па вуліцы Кальцова. На трэцім паверсе яны і ўбачылі пацярпелага, які прасіў аб дапамозе. Прычым, з загрузачнага клапана была відаць толькі галава мужчыны. Выратавальнікі пры дапамозе інструмента вызвалілі яго і перадалі медыкам. Пацярпелы быў шпіталізаваны з папярэднім дыягназам «чэрапна-мазгавая траўма лёгкай ступені». Прычына здарэння высвятляецца.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ Пасля падзеі

АЦЭНКА — СТАНОЎЧАЯ!

Падведзены вынікі хакейнага сезона

Практычна тыдзень прайшоў пасля заканчэння чэмпіянату свету па хакеі ў Чэхіі. Медалі раздадзены, эмоцыі ўжо ўлягліся, а значыць, настаў час падвесці вынікі. Для гэтага на прэс-канферэнцыі сабраліся прадстаўнікі Федэрацыі хакея Беларусі, трэнерскага штаба нацыянальнай каманды і некаторыя гульцы.

Нагадаем, зборная Беларусі на планетарным першынстве сёлета заняла 7-е месца, у 1/4 фіналу нашы хакеісты саступілі будучым чэмпіёнам свету — канадцам. Такое выступленне нацыянальнай зборнай заслужыла станоўчую ацэнку **кіраўніка Федэрацыі хакея Ігара РАЧКОЎСКАГА**. Ён адзначыў, што цяперашні турнір стаў адным з найлепшых для зборнай, а яго вынікі далі зразумець кіраўніцтву, у якім кірунку рухацца далей.

— Мы лічым, што выступленне было даволі ўдалым. Бачыў, як хлопцы выкладваліся ў кожным матчы, пакідалі лёд мокрымі. Настаўнік «Дынама» Любамір Покавіч ужо пасля заканчэння нашага выступлення перадаваў, што славацкая і чэшская прэса згадвае беларускую каманду ў кантэксце таго, як трэба біцца, гуляць на пляцоўцы. Аднак на лаўрах не спачываем. Галоўнае — разумеем, у якім кірунку рухацца.



Фота pressball.by

Лыжкай дзёгцю ў выступленні беларусаў у Празе засталіся прайграныя матчы з буйным лікам канадцам і расіянам. Як аказалася пазней, гэтыя дружыны і разыгралі фінал чэмпіянату.

— Матч з Канадай — гэта як ісці на самы складаны экзамен. Саступілі, перш за ўсё, у сустрэчы з канадцамі псіхалагічна. Проста «перагарэлі». Пасля гульні з расіянамі быў прыгнечаны не таму, што саступілі. У большай ступені — таму, што ў хлопцаў не ўдалося задуманае. Баяўся, каб яны не апусцілі пасля гэтага рукі, змаглі псіхалагічна вытрымаць паражэнне, — адзначыў кіраўнік федэрацыі.

Што тычыцца крытыкі з боку Прэзідэнта краіны адносна зыходу асобных гульняў беларускай каманды на сусветным форуме, Ігар Рачкоўскі растлумачыў, што Прэзідэнт ні слова не сказаў пра дрэннае выступленне ў цэлым на турніры.

— Не зусім карэктна каментаваць словы кіраўніка дзяржавы. Падкрэслю, што Аляксандр Рыгоравіч нічога дрэннага не сказаў пра вынік у цэлым. Многія чамусьці забыліся, што пасля паспяховых матчаў ён накіроўваў віншавальныя тэлеграмы камандзе, дзякаваў за гульню, за самааддачу.

У ходзе прэс-канферэнцыі была закранута і трэнерская тэма. Кіраўнік федэрацыі паведаміў, што Дэйв Льюіс працягне працу са зборнай Беларусі. З паўночнаамерыканскім спецыялістам плануецца заключыць пагадненне на тры гады. Цяпер ідзе адпрацоўка асобных дэталяў кантракта. Таксама ў структуры беларускага хакея застаецца і Уладзімір Бурэ, які адказваў за фізічную падрыхтоўку хакеістаў. Чакаецца, што ён падключыцца да працы з маладзёжнай і юніёрскай зборнымі.

— На працягу першынства размаўлялі з Уладзімірам. Ён расказваў, як ідзе падрыхтоўка каманд у НХЛ, пра заакіянскія кэмп. Галоўны трэнер асноўнай дружыны праводзіць некалькі трэніровак з фармам, а настаўнікі даччыных клубаў сядзяць і канспектуюць. Мы хочам, каб Дэйв гэтак жа папрацаваў з нашай маладзёжкай. Варта падключыць і Бурэ. Асноўная задача маладзёжкі — замацаванне ў топ-10. Дарэчы, у нас мала дзе ёсць трэнеры па фізічнай падрыхтоўцы. Што нявыгадна адрознівае нас ад Канады. Хочам таксама запоўніць гэтую нішу, — распавёў Ігар Рачкоўскі.

У наступным годзе чэмпіянат свету пройдзе ў Расіі, наша зборная згуляе ў Санкт-Пецярбургу ў групе з камандамі Германіі, Францыі, Канады, Фінляндыі, ЗША, Славакіі і Венгрыі.

— Лічу плюсам тое, што мы гуляем у Санкт-Пецярбургу. Там пражывае нямала нашых суайчыннікаў, і беларусам будзе лягчэй туды дабрацца. Група, вядома, цяжкая. Аднак гэта і дазваляе камандзе нацэльвацца на самыя сур'ёзныя задачы. А наогул, уявіце, што думаюць пра групу астатнія ўдзельнікі. Думаеце, яны радуюцца, што ў кампанію да іх трапілі беларусы?..

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ

■

Кніга на службе міру

X Санкт-Петербургский международный книжный салон 21–24 мая 2015

Учора ў горадзе на Няве адкрыўся X Санкт-Пецярбургскі міжнародны кніжны салон. Вітаючы яго ўдзельнікаў, губернатар Санкт-Пецярбурга Георгій Палтаўчанка назваў гэты горад духоўнай сталіцай Расіі, дзе былі створаныя многія вобразы і сімвалы духоўнага і культурнага жыцця Расіі і СССР. Сярод тых, хто вітаў удзельнікаў салона, — старшыня заканадаўчага сходу Санкт-Пецярбурга Вячаслаў Макараў, намеснік кіраўніка Федэральнага агенцтва па друку і масавых камунікацыях Уладзімір Грыгор'еў, прэзідэнт Расійскага кніжнага саюза Сяргей Сцяпашын, старшыня Цэнтрвыбаркама Расіі Уладзімір Чураў.

Фота spb.aif.ru.

Прывітанне ўдзельнікам X Санкт-Пецярбургскага міжнароднага кніжнага салона ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі зачытаў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец. «Мудрае слова пісьменніка заўсёды было носьбітам сапраўдных каштоўнасцей, крытэрыем духоўна-маральнага развіцця грамадства, — гаворыцца ў прывітанні. — Няхай 70-годдзе Вялікай Перамогі стане сімвалічнай згадкай пра тое, як важна, каб літаратурныя творы адлюстроўвалі імкненне людзей да міру, вучылі маладое пакаленне патрыятызму і адказнасці за лёс краіны. Духоўная і культурная роднасць народаў Беларусі і Расіі ва ўсе часы была сапраўднай асновай нашага супрацоўніцтва. Усведамленне сваёй далучанасці да агульных каштоўнасцей, традыцый і ідэалаў дае нам магчымасць заўсёды знаходзіць шляхі да ўзаемаразумення і згоды».

Дэлегацыя Беларусі прымае актыўны ўдзел у многіх канферэнцыях, сустрэчах з чытачамі і прэзентацыях кніг. Асаблівае месца ў рабоце кніжнага форуму займае пленарнае пасяджэнне «Вялікая Перамога вялікай літаратуры». Само правядзенне гэтага мерапрыемства сведчыць пра тое, што асноўная ідэя — ідэя перамогі справядлівасці і міру — павінна быць пранесена праз гады новымі пакаленнямі, незалежна ад таго, у якой краіне яны жывуць.

Беларусь прадставіла на салоне і «Блакадную кнігу» Алеся Адамовіча і Данііла Граніна, выпушчаную ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Гэтае выданне — агульны духоўны набытак Беларусі і Расіі, сумленнае слова пра драматычныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны. З хваляваннем удзельнікі адкрыцця салона выслухалі відэазварот да ўсіх, хто цэніць кнігу, вялікага рускага пісьменніка, пісьменніка-франтавіка Данііла Граніна. Яго перакананасць, што духоўнае развіццё свету немагчыма без кнігі, і ёсць настрой самога свята мастацкага слова ў Санкт-Пецярбургу.

Кірыл ЛАДУЦЬКА,

Санкт-Пецярбург.

■ Разумныя грошы

ФІНАНСЫ АДАПТАВАЛІ ДЛЯ «ЧАЙНІКАЎ»

Аўтары вымушаны былі двойчы перарабляць падручнік пасля крытыкі ад жонак

У Нацыянальным банку выдалі беларускую рэдакцыю кнігі «Фінансавая асвета». Выданне заклікана павысіць узровень ведаў беларусаў у галіне асабістых фінансаў і даступна выкладае такія важныя пытанні, як кіраванне грашовымі сродкамі, планаванне бюджэту, назапашванне зберажэнняў, крэдытаванне, страхаванне і многія іншыя.

ВУЧЫЦЦА НЕ СОРАМНА

Кніга з'яўляецца сумесным праектам Нацыянальнага банка Беларусі і кампаніі Visa. Упершыню навучальны дапаможнік з аналагічнай назвай быў выпушчаны Расійскай эканамічнай школай пры падтрымцы кампаніі Visa і Siti Foundation у 2009 годзе. Аўтары, загадчык кафедры фінансаў Расійскай эканамічнай школы, прафесар, дырэктар праграмы «Майстар фінансаў» Аляксей Гараеў і судырэктар праграмы «Фінансавая асвета» Расійскай эканамічнай школы Валерый Чумачэнка, асноўнай мэтавай аўдыторыяй кнігі лічаць студэнтаў і маладых людзей.

«Нягледзячы на тое, што выданне з'яўляецца прадуктам працы вялікай інтэрнацыянальнай каманды, яно прайшло адаптацыю, зыходзячы з беларускіх рэалій, — заявіў на прэзентацыі **намеснік старшыні праўлення Нацбанка Сяргей ДУБКОЎ.** — Сёння праблема фінансавай асветы актуальная ва ўсім свеце. У нашай краіне ўжо рэалізуецца адпаведны план, у рамках якога мы дастаткова паспяхова рухаемся і супрацоўнічаем з удзельнікамі рынку і міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі, ініцыятывы якіх у гэтай галіне могуць быць вельмі карыснымі і цікавымі. Наша задача — не саромецца вучыцца і генерыраваць новыя ідэі для дасягнення поспеху».

Распаўсюджваць кнігу плануецца праз абласныя ўпраўленні Нацбанка, з дапамогай грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», праз Нацыянальную бібліятэку, а таксама публікацыю на Адзіным інтэрнэт-партале фінансавай асветы.



Валерый Чумачэнка і Аляксей Гараеў падпісалі экзэмпляр падручніка спецыяльна для нашай газеты.

НЕЛЬГА ВЕРЫЦЬ РЭКЛАМЕ

Кніга з'яўляецца акадэмічным дапаможнікам па асабістых фінансах. У лёгкай манеры аўтары расказваюць пра тое, як паспяхова распараджацца асабістым бюджэтам, якія інструменты інвеставання можна выкарыстоўваць для абароны і памнажэння зберажэнняў. Чытэльнасць падручніка і даступнасць для самых далёкіх ад фінансавай сферы людзей аўтары праверылі на сваіх жонках. «Пасля іх крытыкі мы двойчы перарабляліі кнігу, каб яна стала зразумелай для звычайных людзей», — сказаў Валерый Чумачэнка.

«Фінансаваму рынку патрэбны спажыўцы, якія не вераць слепа ў рэкламу, не дапускаюць вялікіх фінансавых памылак. Спажыўцы, якія робяць асэнсаваны выбар», — лічыць адзін з аўтараў. Другі, Аляксей Гараеў, удакладняе: «Кніга дае разуменне сутнасці фінансавых прадуктаў».

АСВЕТА Ў СМАРТФОНАХ

Генеральны менеджар Visa ў СНД і Паўднёва-Усходняй Еўропе Мэндзі ЛЭМБ заявіла, што «фінансавая асвета павінна суправаджаць чалавека ледзь не з самага нараджэння, яшчэ ў дзіцячым садку. І, зразумела, у школьнай ды ўніверсітэцкай адукацыі гэта павінен быць такі ж натуральны прадмет, як і астатнія».

У той жа час **рэгіянальны менеджар Visa ў Беларусі і Малдове Ігар КАВАЛЁЎ** адзначыў высокі ўзровень развіцця безнаяўных плацяжоў у Беларусі: «На канец 2014 года 27,7% ад усіх аперацый былі безнаяўнымі. Гэты вельмі добры паказчык, які сведчыць пра высокую ступень фінансавай адукаванасці жыхароў краіны».

Дарэчы, па словах Сяргея Дубкова, у хуткім часе можа з'явіцца спецыяльны дадатак для смартфонаў па фінансавай асвеце, што дапаможа яшчэ больш ахапіць аўдыторыю.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ,
Фота аўтара

■ Незвычайнае побач

ШТО МЕХАНІЧНАЯ ГАЛАВА... АДКАЗАЛА «ЗВЯЗДЗЕ»?

або Як я размаўляў з... Сакратам!

У Полацкім дзяржаўным універсітэце рэканструявалі механічную галаву, якую зрабілі ў XVIII стагоддзі. Яна, уявіце сабе, адказвала на пытанні. Праўда, злыя языкі пагаворвалі, што рабіў гэта адукаваны манах, якога не было бачна. Але тое, мабыць, і не важна... І ў наш час механічная галава здзіўляе. Па сутнасці ўнутры — яна камп'ютар... Але, калі пачынае размаўляць гучным і строгім голасам, мурашкі па скуры прабягаюць. Адчуванне, што насамрэч галава жывая!

Адкрыццё выставачнай кампазіцыі «Рэканструкцыя праекта Габрыэля Грубера «Механічная галава» адбылося ў рамках Дня ўніверсітэта. Карэспандэнт «Звязды» адзіны з журналістаў асмеліўся задаць пытанне механічнаму цуду.

Габрыэль Грубер — інжынер, механік, матэматык, архітэктар, фізік, медык — быў адным з самых адукаваных людзей свайго часу. Ён жа — генерал Таварыства Ісуса (езуіты) у Расіі. Вядома, што ў 1784 годзе прыехаў у Беларусь. Быў выкладчыкам розных навук у Полацкім езуіцкім калегіуме. Грубера высока цанілі Кацярына II і Павел I. З імі ён пазнаёміўся ў 1797 годзе падчас наведвання імператарам Полацка...

Знакамітасцю музея калегіума была механічная галава, якую і ўзнавілі. У выніку карпатлівых даследаванняў ва ўніверсітэце высветлілі, што яна мела рухомыя вочы, твар Сакрата і адказвала на некалькіх мовах. Цяпер галава размаўляе і па-беларуску (што вельмі прыемна), а таксама на рускай, англійскай, нямецкай і нават лацінскай мовах.

Перад выпрабаваннем гасцей прэзентацыі папярэдзілі, што механізм яшчэ недасканалы. Маўляў, галава ўсё больш імкнецца адказваць на філасофскія пытанні. А вось будзённыя ёй мала цікавыя. Таму можа заўпарціцца і праігнараваць пытанне...

Адказваць галава будзе пасля звароту: «Дазвольце спытаць». Ёй задалі ўсяго некалькі пытанняў. Самым першым было адвечнае: у чым жа ўсё-такі сэнс жыцця? Галава сказала, што ў жыцці няма іншага сэнсу, акрамя таго, які чалавек сам надае яму, раскрываючы свае сілы і жывучы дабратворна. Знайсці сваю дарогу, даведацца пра сваё месца ў жыцці — вось у чым сэнс... Гэта значыць трэба быць самім сабой.

Рэктар універсітэта пацікавіўся, што навучальную ўстанову чакае ў будучыні? У адказ пачуў: «Усё створанае са стараннасцю вялікай, працамі шматгадовымі і намаганнямі многіх годных людзей не толькі да захаванасці прыводзіць, але і прымножыцца. І славу годную далёка за межамі зямлі полацкай знойдзе».

Я запытаўся (вядома, па-беларуску): як павялічыць інтарэс да беларускамоўнай прэсы, у прыватнасці да найстарэйшай газеты «Звязда». Галава доўга думала. Урэшце пачуў спачатку на латыні, а потым на беларускай мове: «Адказ з часам знойдзеце самі».

— Ва ўніверсітэце выкладалі вядомыя людзі Еўропы. Адным з іх з'яўляецца Габрыэль Грубер. Ён разам з іншымі выкладчыкамі і вучнямі стварыў механічную галаву, якая ўвайшла ў гісторыю... У нашы дні мэта ўніверсітэта — знайсці карані і адрадзіць традыцыі, што былі закладзены ў гэтай навучальнай установе, — пасля выпрабаванняў механічнага цуду звярнуўся да прысутных **рэктар Полацкага ўніверсітэта Дзмітрый ЛАЗОЎСКІ, доктар тэхнічных навук, прафесар.**

Нюансамі вырабу галавы падзяліўся **Аляксандр ПРОХАРАЎ, скульптар, дэкан мастацкага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.**

— Дзяніс Дук, доктар гістарычных навук, прафесар, прарэктар універсітэта па вучэбнай рабоце, знайшоў адпаведныя звесткі пра галаву з тварам Сакрата. А рэктар загарэўся ідэяй узнавіць яе. І для гэтага былі прыцягнуты многія спецыялісты. У прыватнасці, я ляпіў галаву. Вырабіў яе з пластычных матэрыялаў (сілікону. — **Аўт.**), каб яна магла гаварыць і маргаць вачыма, — сказаў ён.

Галава — цудоўны «атракцыён», які, безумоўна, упрыгожыць музейную экспазіцыю ўніверсітэта. Але яе плануюць выкарыстоўваць у тым ліку і ў вучэбных мэтах разам з сучаснымі адукацыйнымі «аксесуарамі».

Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара

Полацк — Віцебск



Галава і «Грубер».

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Яўген ЛАШКОЎСКІ:

«НЕЧАКАНЫЯ СІТУАЦЫІ ТРЫМАЮЦЬ ТЭЛЕВЯДУЧАГА Ў ТОНУСЕ»

На тэлеканале АНТ ён адзін з самых вядомых вядучых. Яўген Лашкоўскі быў сярод першых, з кім падпісалі ў свой час кантракт, і вось ужо 13 гадоў мы бачым яго на экране ў «Нашых навінах». На фоне сваіх калег наш герой — асоба не публічная. Пабыць дома, прыгатаваць нешта смачнае альбо сустрэцца з сябрамі, якія захаваліся яшчэ са школы, ці заехаць у госці да бацькоў пасля працы — такі стыль жыцця больш імпануе яму. Мы сустрэліся з тэлевядучым пасля прамога эфіру, каб больш даведацца пра яго жыццё за кадрам...

— У пачатку мая вы адзначылі свой дзень нараджэння. Ёсць прадчуванне жыццёвых перамен?

— Я ў свой дзень нараджэння ляцеў з Маямі і ў самалёце задумаўся пра ўзрост. Мне 34, хаця выглядаю я старэйшым — даюць усе 45, што мяне ніколькі не крыўдзіць, а нават забаўляе. А ўнутрана я адчуваю сябе наогул 27-гадовым хлопцам. Нават свае 33 успрыняў спакойна. Калі ў мяне і бываюць нейкія дэпрэсіўныя настроі, то я вельмі хутка пераключаюся на пазітыўнае. Не люблю доўга філасофстваваць ці корпацца ў сабе. Памятаю, тэлефануе мне летась тата і віншуе з днём нараджэння: «Сынок, са святам цябе! 33 — гэта ўзрост Хрыста». А я яму: «Вось-вось... У гэтым узросце яго забілі!..» Пасля чаго бацька вытрымаў тэатральную паўзу і кажа: «Але ж пасля ён уваскрэс!». Не магу сказаць, быццам з узростам адбываецца нейкая пераацэнка каштоўнасцей, падсумоўваецца нешта. Не хацеў бы нічога вяртаць, бо цалкам задаволены сваім жыццём і ўдзячны за тое, што маю.

— Сваёй атмасферай дзень нараджэння не вяртае вас у дзяцінства?

— Шчыра кажучы, у душы я вялікае дзіця. Магу ноччу сарвацца і некуды паехаць. Адзінае, праз што крыху няёмка ў такія дні, — маё няўменне аддзячыць за падарунак. Я вельмі стрыманы ў сваіх рэакцыях.

— Калі гаварыць пра падарункі, то вам больш падабаецца дарыць іх ці прымаць?

— Адназначна дарыць. У мяне ёсць у гэтым патрэба. І перыядычна я раблю нешта прыемнае сваім блізкім людзям. Напрыклад, калі еду з працы і планую праведаць бацькоў, то спачатку абавязкова іду ў краму, каб набыць ім нешта смачнае. Альбо ёсць у мяне адна суседка па дачы, якая любіць ліліі. Варта мне недзе заўважыць новы прыгожы сорт — я купляю яго ёй у падарунак. У сакавіку быў у Маскве, і вяртаючыся ў Мінск, убачыў прыгожыя ярка-сінія ліліі. Хоць і спазняўся ўжо на цягнік, але ўсё роўна купіў для яе некалькі цыбулінак. А калі мне робяць падарункі, то я думаю пра тое, каб гэта хутчэй скончылася.

— Цяпер даволі актуальнай з'яўляецца тэма фінансавага крызісу. На ваша жыццё ён неяк паўплываў?

— У плане грошай я не аднойчы адчуў гэты ўплыў. У мяне неяк складваецца, што як толькі нешта такое здараецца, то я сутыкаюся з наступствамі, вярнуўшыся аднекуль. Зараз, напрыклад, калі адбылася вядомая сітуацыя з расійскім рублём, я быў у Егіпце. І грашовыя выдаткі ў адпачынку пасля нагадалі пра сябе адчувальна. Зразумела, што і заработная плата была ў адным эквіваленце, а цяпер стала іншай. На дадатковых даходах крызіс таксама адбіўся. Паколькі я вяду яшчэ канцэрты, то, калі недзе арганізацыі ўрэзалі свае фінансавыя выдаткі, і мой даход скарачаецца.

— Вы эканомны чалавек ці лёгка траціце грошы?

— На жаль, я вельмі лёгка аддаю грошы. Не магу навучыцца эканоміць. Добра, калі перад зарплатай хоць нешта застанецца на картцы.

— Вы жывяце за горадам. Цяга да зямлі і прыроды ў вас калі прачнулася?

19.45 Камедыя «Граф Монтэнегра».
21.55 Баявік «Ронін».
0.05 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
1.35 Меладрама «Сур'ёзныя адносіны».

ТБ1000

6.00, 15.50 Камедыя «Знесеныя».
7.30 Камедыя «Ну што, прыехалі?».
9.30 Камедыя «50 першых пацалункаў».
11.30 Драма «Валодаючы табой».
13.40 Драма «Змоўшчыца».
17.20 Драма «Лекар: Вучань Авіцэны».
20.00 Камедыя «Без істэрыкі!».
21.50 Меладрама «Да цуду».
23.50 Драма «Кроўная сувязь».
2.00 Меладрама «Улюбёнцы Амерыкі».
4.00 Драма «Усё найлепшае».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Фантастыка «Падзямелле ведзьмаў».
7.55 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
9.30 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
11.10 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 3».
12.35 Дэтэктыў «Лёс рэзідэнта».
15.20 Меладрама «Вось гэта каханне!».
17.00 Драма «Сібір. Манамур».
18.50 Камедыя «На здрадзе».
20.20 Драма «Пахавайце мяне за плінтусам».

22.20 Меладрама «Марафон».
0.10 Драма «Танкер «Танга».
2.20 Камедыя «Джунглі».
4.00 Драма «Дом».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Мегазаводы.
6.45, 9.25, 17.10, 5.15 Навуковыя недарэчнасці.
7.10 Зрабі або памры.
7.55 Займальная навука.
8.40 Паядынак непераможных.
12.30 Картачны фокуснік.
13.15 Космас. Прастора і час.
14.00 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
15.35 Дзікая прырода Амерыкі.
16.20 Кракадзілы Катумы.
21.00, 0.00, 3.00 Дагістарычныя монстры Гітлера.
21.45, 0.45, 3.45 Прызнанні нацыстаў.
22.30, 4.30 Фатальная стыхія.
1.30 Уварванне на Зямлю.

DISCOVERY

8.00, 17.10, 5.35 З любові да машын.
8.50, 15.30 Гаражная каманда.
9.40, 16.20, 0.40, 6.25 Махінатары.
10.30 Рэальныя дальнабойшчыкі.
11.20 Залатая ліхаманка.
13.00, 4.00 Скарбы з каморкі.
13.50, 23.50 Склады: бітва ў Канадзе.
14.40 Экстрэмальныя калекцыянеры.
18.00 Дамы на дрэвах.
18.50 Ванная пад ключ.
19.40 Акварыумны бізнес.
20.30 Скрыўленне часу.
23.00 Зорнае выжыванне.
1.30 Востраў.
2.20 Перш за ўсё — самалёты.
3.10 Неверагодны хмарачос.
4.50 Як гэта ўстроена?
5.10 Як гэта зроблена?
7.12 Праз магію да зорак.

■ 9 фактаў пра...

САБАК-ВЫРАТАВАЛЬНІКАЎ

Тысячы гадоў яны ахоўваюць і абараняюць, дапамагаюць на паляванні і пры перавозцы грузаў. А калі прыйшла бяда, сабакі-выратавальнікі робяць усё, каб захаваць жыццё чалавека любой цаной. Спецыялісты падлічылі, што адзін сабака на заданні па пошуку замяняе ад 20 да 30 чалавек.

1. Сабак-выратавальнікаў можна прыкладна падзяліць на 4 катэгорыі: шукальнікі з паветра — бегаюць па зададзенай тэрыторыі і шукаюць людзей; шукальнікі па следзе — шукаюць людзей па слядах; тыя, якія адрозніваюць пахі, якія могуць знайсці канкрэтнага чалавека; тыя, якія не адрозніваюць, яны шукаюць увогуле людзей або целы.

2. Самыя распаўсюджаныя пароды пошукава-выратавальных сабак: ньюфаўндленд, сенбернар, нямецкая аўчарка, лабрадор, даберман, спаніэль. Для пошуку і выратавання на вадзе няма лепшага за ньюфаўндленда, якога з гэтай нагоды яшчэ называюць вадалазам, а для пошуку па следзе — за нямецкую аўчарку.

3. Першыя сабакі-выратавальнікі з'явіліся яшчэ некалькі стагоддзяў таму, іх галоўным прызначэннем быў пошук людзей, якія заблукалі падчас снежнай буры. На працягу некалькіх соцень гадоў такіх сабак разводзілі ў Францыі ў манастыры Святога Бернара. Гэтыя сабакі часам малююцца з невялікімі бочачкамі на шыі. Паводле адной версіі, бочачка з сагравальным напоем была патрэбна для таго, каб падарожнік мог хутчэй сагрэцца.

4. Сабакі, якія навучаны пошуку ахвяр катастрофы або няшчаснага выпадку, могуць са стапрацэнтнай дакладнасцю зімой знаходзіць целы людзей, не блытаючы іх з жывёламі.

5. Сабака — лавінны выратавальнік — здольны адчуць пах чалавека скрозь пяціметровую тоўшчу снегу. Сенбернары, нямецкія аўчаркі і лабрадоры — найлепшыя ў гэтай дысцыпліне.

6. Асноўнай рухаючай сілай сабак-выратавальнікаў з'яўляецца любоў да гульні. Сабакі, якія вядуць пошукавыя работы, лічаць, што гуляюць. Выратавальнікі-людзі часам спецыяльна хаваюцца на тэрыторыі пошуку, таму што сабакі, калі яны знаходзяць падчас аперацыі толькі целы, лічаць, што гульня ідзе няправільна.

7. Галоўным для паспяховай працы сабакі-следапыта з'яўляецца час. Ноччу сабакі шукаюць лепш, чым днём, дзякуючы ўзыходзячым струменям паветра.

8. Сабакі-выратавальнікі па-розному паведамляюць пра знаходку: следапыты спыняюцца і гучна брэшуць, лавінныя сабакі вяртаюцца і вядуць людзей да знойдзенага месца.

9. Сярод сенбернараў легендарным стаў сабака па мянушцы Бары. Ён адчуваў набліжэнне снежнай буры больш чым за гадзіну да пачатку і станавіўся вельмі трывожным. Аднойчы ён выратаваў дзіця, якое было глыбока пад снежнай лавінай. Сабака знайшоў дзіця і лізаў яму твар да таго часу, пакуль тое не ачуняла. Легендарны сабака выратаваў жыццё не менш як сарака чалавекам. Існуе легенда, што ён быў забіты сорак першым выратаваным, які прыняў Бары за ваўка. Сабака пражыў 14 гадоў, і пасля смерці Бары ўстанавілі помнік на парыжскіх могілках для сабак з памятным, але ўсё ж не адпавядаючым праўдзе, надпісам: «Бары, які выратаваў сорак чалавек і быў забіты сорак першым» *(на фота)*.

■ Замор'е

СЦЯГ ДЛЯ ЗАВАЁЎНІКАЎ КОСМАСУ

Шведскі дызайнер Оскар Пернефельт стварыў макет сцяга Зямлі, які мог бы быць выкарыстаны касманаўтамі ў экспедыцыях і размешчаны на іншых планетах, пра што паведамляецца на афіцыйным сайце праекта.

У цэнтры сцяга намаляваны сем белых кольцаў, якія перасякаюцца і ўтвараюць кветку — сімвал жыцця на Зямлі. Іх перапляценне з'яўляецца метафарай таго, што ўсё на планеце так ці інакш звязана паміж сабой. Сіні колер, абраны ў якасці фону, сімвалізуе ваду, неабходную для жыцця. Таксама на сайце дызайнера размешчаны прыклады выкарыстання сцяга. Пернефельт прапануе змяшчаць яго на нашыўках скафандраў, выкарыстоўваць падчас спартыўных гульняў і на афіцыйных мерапрыемствах. Кшталту міжпланетных гульняў? Пажывём, але мы наўрад ці пабачым.

У каментарыях да працы дызайнер адзначыў, што сцяг закліканы нагадаць людзям, што ўсе яны жывуць на адной планеце і павінны клапаціцца адзін пра аднаго, незалежна ад нацыянальных межаў. На сайце ўдакладняецца, што стварэнне новага сімвала стала для Пернефельта дыпломнай працай у школе дызайну Beckmans, размешчанай у Стакгольме.

САМЫЯ КУЛЬТАВЫЯ... НОГІ

Амерыканцы любяць кляпаць рознага кшталту спісы-топы самага прыгожага, рэдкага, дарагога, жудаснага і г.д. Прычым лідзіруючыя пазіцыі ў большасці сваёй займае айчынны, іх, так бы мовіць, «прадукт». Гэтым разам яны забаўляліся на тэму жаночых ног. У выніку незабыўная Мэрылін Манро прызнана ўладальніцай самых культавых (!) ног у гісторыі, як паведамляе Metro са спасылкай на вынікі апытання, праведзенага брэндам Wilkinson Sword.

Як піша выданне, за ногі актрысы аддалі галасы 47% рэспандэнтаў. Другое месца ў рэйтынгу атрымала спявачка Кайлі Міноўг, трэцяе — топмадэль 1960-х Твігі. Дзясятка самых прыгожых пар ног наступная: 1. Мэрылін Манро, актрыса (47% галасоў). 2. Кайлі Міноўг, спявачка (22%). 3. Твігі, мадэль (17%). 4. Ціна Цёрнер, спявачка (16%). 5. Джэры Холіўэл, спявачка (15%). 6. Бэці Грэйбл, актрыса і спявачка (7,8%). 7. Кейт Мідлтан, герцагіня Кембрыджская (7,4%). 8. Анжаліна Джалі, актрыса (7,2%). 9. Вікторыя Пендлтан, спартсменка (6,5%). 10. Одры Хепберн, актрыса (4,9%).

Як ні дзіўна, акрамя амерыканак, у топе прысутнічаюць і іншаземкі. У даследаванні прынялі ўдзел больш за тысячу жанчын ва ўзросце ад 16 да 55 гадоў. Падобныя рэйтынгі прывабнасці «зорак» рэгулярна складаюцца рознымі брэндамі і выданнямі. У красавіку амерыканскі часопіс FHM назваў самай сексуальнай жанчынай у свеце актрысу Мішэль Кіган, а часопіс People — самай прыгожай актрысу Сандру Булак.

Іван КУПАРВАС

НЯДЗЕЛЯ, 31 МАЯ

БЕЛАРУСЬ 1

7.10, 15.30 Меладрама «У рукі два берагі». 2-я серыя.
8.50 Слова Мітрапаліта Паўла на Дзень Святой Тройцы.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
9.40, 0.35 Серыял «Кухня».
10.45 «Пра ежу!».
11.20 XXL WOMAN TV.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 Зона Х. Вынікі тыдня.
13.05 Тайны следства.
13.40 Каробка перадач.
14.15 Вакол планеты.
15.15 Твой горад.
17.20 Нашы.
17.35 Меладрама «Падары мне нядзелю». 3-я і 4-я серыі.
21.00 Галоўны эфір.
21.55 Навіны надвор'я.
22.15 Дыялогі пра цывілізацыю.
22.50 Камедыя «Масква—Лапушкі».

БЕЛАРУСЬ 2

6.55 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
8.10, 21.45 Серыял «Шчаслівыя разам».
10.00 Я хачу гэта ўбачыць!
10.35, 20.05 Тэлебарометр.
10.40 «Fitnews».
11.20 Ваша лато.
11.50 Латарэя «Пяцёрачка».
12.05 «Кітай: інструкцыя па вывучэнні».
12.35 «Зразумець і абясшкодзіць».
13.10 Серыял «Мая цудоўная нянька».
15.10 Фантастыка «Успомніць усё».
17.20 «Comedy woman».
18.25 Ікра.
19.15 Суперлато.
20.40 Кіпень.
21.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэасапіс.
21.35 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
23.45 Вышэй за дах.
0.15 Камедыя «Таўстун на рынгу».

БЕЛАРУСЬ 3

7.55, 13.55, 16.15, 0.00 Калейдаскоп.
8.05, 14.05, 16.25, 0.10 «Размовы пра духоўнае».
8.15 «Емяльян Пугачоў». Драма. Фільм першы «Нявольнікі».

9.20 «Емяльян Пугачоў». Драма. Фільм другі «Воля, крывёю абмытая».
10.45 «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Аляксандр Памідораў.
11.25 «Наперад у мінулае».
11.50, 21.00 Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
12.45 «Калі ласка, або Пабочным асобам уваход забаронены!» Камедыя.
14.15 «Вепскі запавет». Дак. фільм.
15.10 «Суседзі». Камедыя.
16.35 «Залаты Віцязь. Мікалай Бурляеў». Дак. фільм.
17.35, 19.10 «Андрэй Рублёў». Драма.
18.55 «Беларускі народны каляндар». Сёмуха.
20.45 Калыханка.
21.55 «Бяседа». 20 гадоў.
23.25 «Культпрасвет».

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 0.40 PRO спорт. Навіны.
7.45 Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. Другі матч.
9.15 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Фінал чатырох. Першы паўфінал. «Барселона» (Іспанія) — «Віве» (Польшча).
10.40 Баскетбол. НБА. Фінал Заходняй канферэнцыі. Шосты матч. «Х'юстан» — «Голдэн Стэйт».
12.55 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Фінал чатырох. Другі паўфінал. «Кіль» (Германія) — «Веспрэм» (Венгрыя).
14.25 Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. Трэці матч.
16.10 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Фінал чатырох. Матч за трэцяе месца.
17.55 Фактар сілы.
18.25 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэасапіс.
18.55 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Фінал чатырох. Фінал.
20.40 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — ФК «Мінск».
22.40 Змяшаныя адзінаборствы. М-1 Global.

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.40 «Фазэнда».
11.10 Маст. фільм «Сфера вядзьмарства».
12.35 «Дарослыя і дзеці». Святочны канцэрт да Дня абароны дзяцей.
14.00 Серыял «Ой, ма-мачкі!».
16.15 Навіны спорту.
16.20 «Тэорыя змовы».
17.15 «Кропля ў кроплю!».
20.00 Контуры.
21.05 «Вызваленая Еўропа».
22.00 Маст. фільм «Стальны матылёк».
0.00 Трылер «Омен».

СТБ

6.00 «Студэнты International». Серыял.
7.30 «Скардзіцца дазваляецца».
7.50, 16.50 «Аўтапанарама».
8.15 Маст. фільм «Груз».
10.10 «Чыстая праца».
11.00 «Вялікае снеданне».
11.40 «Гэта — мой дом!».
12.15, 13.40 Маст. фільм «Востраў скарбаў».
13.30, 16.30 «24 гадзіны».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
17.20 «Ваенная тайна».
19.30 «Тыдзень».
20.25 Баявік «Пад прыцэлам».
22.10 «Зорны рынг».
23.10 «Масква. Дзень і ноч».
0.05 «Легенды Рэтра FM».

МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
6.15 М/ф.
7.20 Маст. фільм «Цырк».
9.05 «Ведаем рускую».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Чаму я?»
10.45, 4.20 Маст. фільм «Бландзінка за вуглом».
12.20, 2.40 Маст. фільм «Дзясятая ахвяра».
14.00 Маст. фільм «Жаніх напракат».
16.15, 22.00 Серыял «Атрад».
21.00 «Разам».
0.50 Маст. фільм «Парклэнд».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Ха». Маленькія камедыі.
7.50 Маст. фільм «Вярні мяне».

11.00, 14.00 Весткі.
11.25 «Сам себе рэжысёр».
12.15 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
12.45 «Ранішняя пошта».
13.25 М/ф.
14.10 Маст. фільм «Цячэ рака Волга».
16.00 Да Міжнароднага дня абароны дзяцей. Фестываль дзіцячай мастацкай гімнастыкі «Аліна».
17.35 «Пакой смеху».
18.10, 21.50 Маст. фільм «Бераг надзеі».
20.00 Весткі тыдня.
23.50 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.05, 8.20 Серыял «ППС».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.50 «Медыцынскія тайны».
9.25 «Ядзім дома».
10.20 «Першая перадача».
11.05 «Цуд тэхнікі».
11.50 «Дачны адказ».
13.20 «Я худзею».
14.15 Серыял «Каця».
16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
18.00 Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
19.00 «Сёння. Выніковая праграма».
20.00 Дэтэктыў «Абмен».
23.25 «Спіс Норкіна».

8 КАНАЛ

9.00, 14.50, 18.45, 21.00 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
9.30 «Дзень Святой Тройцы».
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30, 12.50, 16.30, 20.55 «Хатняя крама».
10.45, 23.30 «Хобі TV».
11.35 «Кінаблакнот».
11.50 «Лэдзі-дэтэктыў».
13.00 Камедыя «Паміж анёлам і чортам».
14.55 Камедыя «Уцекачы».
17.00 Серыял «Каломба».
18.50 Драма «Ізумрудны лес».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Драма «Жанчына на папскім прастоле».

ВТВ

6.00 «PLAY».
7.30 М/ф «Смяшарыкі».
8.00, 14.30 Серыял «Ералаш».
9.00 Серыял «Вароніны».
10.00, 2.00 «Турбаміксер».
12.00 Серыял «Сямейны бізнес».
13.30, 4.30 «Паспець за 24 гадзіны».
15.30 Фантастыка «Галодныя гульні».
18.00, 1.00 «Ленінградскі Stand-up клуб».
19.00 «Уральскія пельмені».
20.30 Баявік «Рэд».
23.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
23.30 «Нерэальная гісторыя».
0.00 Скетчком «Студэнты».
0.30, 4.30 «Лаві момант».
5.00 Серыял «Калыска над бездонню».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Святы». Дзень Святой Тройцы.
10.35 «Калі дрэвы былі вялікімі». Маст. фільм.
12.10 «Легенды сусветнага кіно». Ала Назімава.
12.40 «Расія, любоў мая!».
13.10 «Феномен Кулібіна». Дак. фільм.
13.50 «Што рабіць?».
14.35 «Антуан Ларан Лавуазье». Дак. фільм.
14.45 «Пешшу...». Ад Масквы да Берліна.
15.15 «Цалкам сур'ёзна». Маст. фільм.
16.15 Да 95-годдзя з дня нараджэння Давіда Самойлава. «З позняй пушкінскай плеяды...». Дак. фільм.
16.55 «Заздароўная песня». Вечар-прысвячэнне Давіду Самойлаву.
18.00 «Кантэкст».
18.40 «Раберта Аланья. Страсць». Канцэрт у Версалі.
19.35 Да юбілею Яўгеніі Сімонавай. «Лінія жыцця».
20.25 «Звычайны цуд». Маст. фільм.
22.50 «Вена, Плошча Герояў». Канцэрт Венскага сімфанічнага аркестра. Дырыжор Філіп Жордан.
0.05 «Цалкам сур'ёзна». Маст. фільм.
1.00 «Больш чым каханне». Людміла Макарава і Яфім Капелян.
1.40 «Пра ракаў». М/ф для дарослых.
1.55 «Шукальнікі». «Тампліеры ў Савецкай Расіі».
2.40 «Сусветныя скарбы культуры».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1963-і. 1-я частка. 2010 год.
7.05, 8.45, 9.40, 11.00, 11.45, 13.00, 14.00, 14.35, 17.15, 17.35, 18.40, 20.30, 21.30, 23.30, 0.05, 0.55, 2.20, 3.40, 5.00, 5.40 Музычная настальгія.
7.20 Маст. фільм «Ад снегу да снегу».
9.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00 «Колба часу».
11.20 «Атланты трымаюць неба». «Мілей бераг з мора».
12.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1963-і. 2-я частка. 2010 год.
13.40 М/ф «Цудоўны званочак».
14.30, 0.00 «Прэс-экспрэс». 1994 год.
15.00 «Быў час». 2009 год.
16.00 Маст. фільм «Увага — цунамі!».
17.30 М/ф «Чужы голас».
18.00 «Акулы пяра». Любоў Успенская. 1995 год.
19.30 «Назад у СССР» з В. Мукусевым: «Варожыя галасы». 2007 год.
21.00 М/ф «Залатая антылопа».
22.00 Маст. фільм «Ваенна-палявы раман».
0.40 М/ф «Заяц і вожык».
1.10 Маст. фільм «Адпачынак, які не адбыўся».
4.00 «Народжаныя ў СССР».
5.20 М/ф «У лясным гушчары».

EUROSPORT

9.30 Веласпорт.
10.30, 22.00 Тэніс. Супрацьстаянні дня.
11.30, 21.30 Тэніс. Гейм, сэт і Матс.
12.00, 18.45, 23.15 Тэніс. «Ралан Гарос».
15.15, 18.30 Веласпорт. Нацыянальны тур Італіі.
23.30 Аўтагонкі. Сусветная серыя Рэно.
0.00 Футбол. Старшая ліга футбола. «Сіэтл Саўндэрз» — «Нью-Ёрк Рэд Булз».
2.00 Аўта- і мотаспорт.
2.15 Футбол. Старшая ліга футбола. «Нью-Інглэнд Рэвалюшн» — «Лос-Анджэлес Гэлаксі».

КАМЕДЫЯ

6.00, 9.55, 17.35, 22.00, 3.30 Серыял «Нумар адзін спадар Кхан».
7.00 Камедыя «Улётны рэйс».
8.30 Камедыя «Мужчына з гарантыяй».

10.50 Меладрама «Па прыкметах сумяшчальнасці».
12.25 Камедыя «Сямейны план».
14.00, 0.40, 2.50 Скетчком «Паміж намі».
14.25 Меладрама «Каханне і іншыя катастрофы».
16.00 Камедыя «Мужчынская праца».
18.35 Камедыя «Той яшчэ Карласан!».
20.20 Камедыя «Касцюм Санты».
23.10 Камедыя «Патрабуюцца карэктныя паводзіны».
1.15 Камедыя «Лары Краўн».
3.10 Серыял «Былыя».
4.00 Камедыя «Канікулы на моры».

ТБ3

6.00 М/ф.
10.25, 5.15 «Нераскрытыя тайны».
11.20 «Паненка і кулінар».
11.55, 2.20 Серыял «Тайны следства».
15.15 «Сто пытанняў даросламу».
16.00 «Жонка. Гісторыя кахання».
17.20 «Без падману».
18.10 Дак. фільм «Руса Турыста. Упершыню за мяжой».
19.45 «Доказ віны».
20.35 Фантастыка «2012».
23.25 «Асцярожна, махляры!».
23.55 «Часова даступны».
0.50 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

ТБ1000

6.00 Драма «Валодаючы табой».
8.00 Меладрама «Улюбёнцы Амерыкі».
10.00, 18.20 Меладрама «Будзь маім хлопцам на пяць хвілін».
12.00 Драма «Добрай ночы, Месяц».
14.40 Камедыя «Мільён для чайнікаў».
16.30 Драма «Дзіяна: Гісторыя кахання».
20.00 Драма «Кроўная сувязь».
22.20 Драма «Усё самае лепшае».
0.00 Драма «Лекар: Вучань Авіцэны».
2.30 Драма «Паляванне».
4.30 Драма «Басанож па слізняках».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Камедыя «Мамачкі».
8.20 Казка «Пасля дожджыку ў чацвер».
9.50, 4.50 Камедыя «Нянькі».
11.40 Дэтэктыў «Вяртанне рэзідэнта».
14.20 Драма «Пахавайце мяне за плінтусам».
16.20 Драма «Золата».
18.20 Трылер «Як бы не так».
20.20 Баявік «Васьмёрка».
21.45 Драма «Географ глобус прапіў».
23.45 Меладрама «Гаспадыня «Белых начэй».
1.30 Драма «Паляванне на Вярвольфа».
3.25 Драма «Ганна і камандор».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00, 22.30, 1.30, 4.30 Мегазаводы.
6.45, 9.25, 17.10 Навуковыя недарэчнасці.
7.10 Зрабі або памры.
7.55 Займальная навука.
8.40 Паядынак непераможных.
12.30, 20.15 Код небяспекі.
13.15 Космас. Прастора і час.
14.00 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
15.35 У пошуках гіганцкага кальмара.
16.20 Суперзмяя.
21.00, 0.00, 3.00 Аўта-SOS.

DISCOVERY

8.00 Скарбы з каморкі.
8.50, 2.20 Экстрэмальныя калекцыянеры.
9.40 Склады: бітва ў Канадзе.
10.30, 4.00 Аляска: апошні рубеж.
11.20 Неверагодны хмарачос.
12.10, 18.00, 3.10, 5.35 Аляска: сям'я з лесу.
13.00 Зорнае выжыванне.
13.50 Акварыумны бізнес.
14.40 Ванная пад ключ.
15.30, 22.10 Хуткія і гучныя.
16.20, 23.00 А ты б выжыў?
17.10, 23.50 Праз магію да зорак.
20.30 Залатая ліхаманка.
0.40 Рэальныя дальнабойшчыкі.
1.30 Гаражная каманда.
4.48 Як гэта ўстроена?
5.12 Як гэта зроблена?

■ Простая мова

ЧАЛАВЕК МЯРКУЕ...

«Мама, а калі ў нашай кватэры будзе цёпла?» — «У маі, сынок, у маі». Падманула дзіця гэтая маладзіца: май сёлета выдаўся халодным.

ЯК НАРАДЖАЮЦЦА ПЛЁТКІ

Сёстры баба Ліда і баба Ганька зімавалі дома, у вёсцы. Іх сусед, дзед Грыша — у горадзе, толькі вярнуўся.

Да іх, да лавачкі, ён, вядома ж, падышоў, павітаўся.

І не больш за тое: адразу ж цягу, адразу ж дамоў... А ўжо там — то ў склеп, то ў хлеў, то ў хату... Толькі дзверы ляпаюць.

— Во, ты глянь, як носіцца! — бачачы гэта, зайздросцяць суседкі. — І ногі яму не баляць!

— Значыць, у нявесткі добра было, значыць, глядзела яна старога.

— А ты дык ужо і разабралася... Можа, добра, а можа і не. Можа, яго ветрам ганяе?

— А то і праўда...

ВАЙНА ПАД СТРЭХАМІ

Прыяцелька свайго шчасця не ведала: жыла, як белы чалавек, са сваім катом, у сваёй кватэры, аж пакуль суседнюю нейкі дуралей не купіў. З месяц таму пераехаў, жыве, днём чорт ведае, чым ён займаецца, а вось ноч-апоўнач — кінафільмы глядзіць. І каб жа тады, як людзі, збавіць хоць трохі гук, а то ж не!

— У мяне праз яго — ну ніякага сну, — скардзіцца кабета.

— А ты падушку на галаву... — раяць добразычліўцы.

— ...Каму? Суседу? — удакладняе Марына.

— Сабе таксама добра... І бярушы ў аптэцы прадаюць... Можна яшчэ ваты ў вушы ўткнуць.

— Спрабавала... Не памагае! Адно — калі два пальцы ўсунуць. Вось так, — паказвае на сабе жанчына. — Доўга, праўда, не патрымаеш...

— А ты іх — у клей «Момент». А потым — у вушы і спі сабе.

...Нікчэмная, пустая парада. Прыяцелька ёй, вядома ж, не скарыстаецца, але па начах, можа, успомніць калі, можа, усміхнецца.

Што безумоўна ж, лепш, чым з падушкай ісці на суседа.

УСПОМНІЛА БАБА...

Чаго не зробяць вытворцы, каб прасунуць тавар! І яшчэ зразумела, каб новы! А то ж... малако. Што-што, а яно, як здавалася, у рэкламе патрэбы не мае. Праўда, само, а вось цана... Білборды па горадзе: літр — шэсць тысяч пяцьсот рублёў!

Успомніла баба, як дзеўкай была: а некалі на тысячу менш каштавалі «Жыгулі».

ЛЯЧЫСЯ, НЯБОЖА...

Сябрук напалохаўся: сэрца з рытму сарвалася — адзін раз, другі... Мусіў пайсці па дактарах. Тыя, як варта было чакаць, «паганялі» яго па кабінетах — абследавалі, навыпісвалі розных рэцэптаў.

З імі ён у найбліжэйшую аптэку зайшоў — прыцаніўся да лекаў.

Сэрца забалела яшчэ больш.

ГЭТА ПА-НАШАМУ?

Дом. Вячэра. Гарбата.

З ёй, гарачай, ды ў цёплай кампаніі добра пасядзець за сталом, добра (калі на самоце) пастаяць на балконе. І тады — па глытку адпіваючы — заадно паглядзець на прыціхлы праспект, на асвечаныя ліхтарамі белыя «свечкі» каштанаў, на стаянку машын.

Там, дарэчы, ці не ўвесь аўтапрам сабраны. Столькі розных мадэляў... Яблыку не ўпасці, а ўжо машыну паставіць...

Зрэшты, адна «дзірачка», здаецца, вызваляецца... Праўда, на хвіліну, не болей, бо потым нехта пад'язджае, досыць спрытна паркуецца, выходзіць са сваёй машыны, прыстройваецца (прабачце!) да задняга кола суседняй — патрэбу спраўляе.

І гэта (калі машына чужая) можна зразумець, і нават апраўдаць. Тым, прынамсі, што патрэба — малая і, відаць жа, вельмі неадкладная. Тым, што раён, магчыма, незнаёмы (дзе тут будзеш прыбіральню шукаць?), а гадзіна шарая, людзей паблізу няма ды і шкоды вялікай таксама — ні зямлі, ні машыне...

Але ж... Ну чаму не сваёй?

КРЫЎДА

Анекдот. Мужчына-кадравік пытаецца ў жанчыны:

— Колькі вам гадоў?

Тая какетліва:

— Ну, да 30 мне бліжэй, чым да 20.

— А калі канкрэтна?

— 50.

...Сцяпанаўне — куды болей, але яна малайчына: можа не ўспомніць, што сёння ела на сняданак, але пры гэтым ва ўсіх падрабязнасцях расказаць, як пасля смерці бацькі маці выйшла замуж за іншага, як адзін за адным нарадзіла чацвёра дзяцей, як душылася працай сама і «душыла» яе, старэйшую, бо ўсіх меншых трэба было карміць, абмываць, забаўляць...

— Во якое дзяцінства... Мама каб хоць разок абняла мяне, каб пацалавала... Як абакрала...

І дзіця, і сябе.

ДВОЕ

Ці любіла яна?

Магчыма...

Як магчыма і тое, што проста час быў выходзіць замуж, клікаў «туды» хлопец ва ўсіх адносінах добры, а ўжо ж закаханы... За такога грэх не ісці.

Бацькі ім вяселле прыгожае зладзілі: што для вёскі тады ў навіну было — прафесійнага фатографа нанялі. Ён шмат што здымаў — і ў ЗАГСе, і дома. Усе госці на картачках! А ўжо ж нявеста з жаніхом...

На адным са здымкаў яны ўдваіх — твар у твар... Ён высокі, даўгарукі. І яна быццам птушачка: трапіла ў «сіло» (з абдымкаў) і ўсё — жыць ці не жыць, а калі жыць, то як, залежыць ад «лаўца».

...Ён, той «лавец» і муж, вось ужо трыццаць гадоў гэты здымак з сабою носіць — як ілюстрацыю да крылатага: «Мы нясём адказ за тых, каго прыручылі».

СКАЖЫ...

Адна і тая ж Матрона, толькі ў іншай спадніцы: раней ля першых сядзенняў у грамадскім транспарце быў надпіс кшталту «Месцы для пасажыраў з дзецьмі ды інвалідаў», цяпер — павесілі спецыяльны знак.

А толку, можна сказаць, ніякага, бо месцаў па-ранейшаму няма. Дакладней — ёсць, але яны заняты, прычым сапраўднымі інвалідамі — па зроку (бо, уткнуўшыся ў свае тэлефоны-планшэты, нічога вакол не бачаць), па слыху (бо ў навушніках нічога не чуюць...). Ну, хіба калі «ў лоб» сказаць:

— Малады чалавек, гэта месца маё.

Голас у дзеда па-маладому бадзёры, гучны, таму з месцаў «зрываюцца» аж тры «інваліды». Чацвёрты (на добрым падпітку) — па-ранейшаму сядзіць, а горш за тое, праз губу цэдзіць:

— Тваё месца, дзед, на могілках...

— Як вы можаце?! Як вам не сорамна?! — заступаюцца за чалавека іншыя пасажыры. Але той іх «паслуг» не прымае. «Не трэба, я сам», — спыняе ўсіх жэстам і, падсеўшы да таго «інваліда», па-змоўніцку пытаецца:

— Слухай, у цябе дзядуля ёсць?

Дзяцюк, вылупіўшы вочы, глядзіць на старога.

— ...А бабуля? — працягвае той. — Па вачах бачу — ёсць... Дык ты як прыедзеш да іх, вазьмі і скажы: «Ваша месца — на могілках». Толькі ж глядзі — не забудзься...

Дзед гаворыць нешта яшчэ, але аўтобус якраз спыняецца — адчыняе дзверы. Хлопец куляй вылятае на прыпынак.

...Не для таго, відаць, каб хутчэй прыбегчы дамоў — да бабулі з дзедам. Не для таго, каб сказаць ім — пра месца.

ПАЙСЦІ... КАБ ЗАСТАЦЦА

З Коласа:

...І ты , чалавеча,
як снег у адлігу:
Упаў і сканаў, і няма.

Што хоць крыху ды суцяшае — сканаў не першым і не апошнім, штосьці паспеў зрабіць, пакінуць нашчадкаў. У Міхайлавіча (светлай памяці!) аж сямёра ўнукаўпраўнукаў — у вялікай, раптам апусцелай хаце з досыць яркай пазнакай: «Здесь живет ветеран Великой Отечественной войны»...

— Усё, болей «не живет», — кажа сыну нехта з радні. — Давядзецца здымаць «шыльду»?

— А навошта? — не разумее той. — Хай вісіць.

...І няхай хоць чужыя людзі думаюць, што ветэран тут жыве. І што іх у нас яшчэ шмат.

ЧАЛАВЕК МЯРКУЕ...

Кватэра была як лялечка — утульная, чыстая і да краёчкаў, як той казаў, поўная розным дабром. «Усё Васечку, усё сыночку нашаму будзе, калі мы памром», — разважалі бацькі.

А калі памерлі, Васечка быў другі раз няўдала жанаты, хворы, таму ў хуткім часе не стала і яго.

Кватэра — з усім тым нажытым дабром — дасталася яго ўдаве (для бацькоў — чужой чужаніцы). І яна ў ёй жыве... З новым мужам ды дзецьмі ад першага...

Праўду кажуць: чалавек мяркуе, а Бог размяркоўвае.

Хоць часам і неяк дзіўна.

«НА БЛАКІТНЫМ СПОДАЧКУ»

У вёсцы глухіх платоў, дзякаваць Богу, мала — далёка відаць, далёка чуваць.

— Э-э, сусед, ты куды гэта зганяў? — нясецца над штыкетнікам.

— У свой город.

— А што пад пахай нясеш?

— Не паверыш, паўлітра адкапаў!

— Як гэта?.. Пакажы!

— Табе аднаму — нецікава... Ты давай, унука пакліч.

Дзе ўнук (гарадскі, гадкоў чатырох), там і сын з нявесткай — натоўп, можна сказаць. Сусед задаволены:

— Баяцца не будзеце? — па-змоўніцку пытаецца ў гарадскіх. І, пачуўшы адказ (найперш ад дзіцяці), «раскрывае карты»: «лёгкім рухам правай рукі» вымае з-за пазухі чорны «абрэз» краталоўкі, вытрасае на асфальт... крата.

— Фу, якая гадасць!

— А ён жывы?!

— Ад'еўся, бач! Гладкі-гладкі...

— А які прыгожанькі...

— Можна пагладзіць?

— Вось каб на футра такіх налавіць! — нясецца з «натоўпу».

Расчараваны голас толькі адзін:

— Цьфу... А казаў, «паўлітра адкапаў...»

— І не падмануў, — смела даводзіць сусед. — У нас, брат, з жонкай дамова: я ёй крата на блакітным сподачку, а яна мне — бутэльку.

...Мала пакуль што ў вёсцы глухіх ды высокіх платоў: далёка відаць тут. І гэтак жа далёка чуваць.

Той мясцовы Шчукар, прынамсі, праз нейкія паўгадзінкі ўжо зноў у гародзе — штосьці капае... Ды з вясёлым посвістам...

Можа, граду, можа, чарговыя паўлітра?

Валянціна ДОЎНАР.

■ Неасабісты суб'ектыў

ПІЯНЕРСКІ КАСЦЁР

Як ператварыць віртуальныя прыгоды ў сапраўдныя, і навошта гэта патрэбна

ГЭТА першая сёлета сапраўдная майская навальніца, што балявала над горадам добрую гадзіну, высвеціла маланкамі адзін з самых яркіх дзіцячых успамінаў. Школа ідзе «на касцёр». Была такая добрая традыцыя: на дзень нараджэння піянерскай арганізацыі пасля скарочаных заняткаў усе вучні і настаўнікі арганізавана выпраўляліся на бераг возера. Ад школы гэта было далекавата, дый ад самой вёскі адлегласць добрая, таму гэты арганізаваны паход успрымаўся як цікавая прыгода. Вядома, усе атрыбуты былі ў наяўнасці: і горны, і барабаны, і сцягі. Але прымусу, як той казаў, не было — было проста весела ісці шумным натоўпам па квітнеючай вясковай вуліцы.

Як і належала, праводзілі ўрачыстую лінейку, з рапартамі кожнага атрада і старшыні савета дружыны старэйшаму піянерважатаму. Гэта таксама было весела, асабліва калі ўся лінейка пачынала дружна крычаць дэвіз дружыны імя Сяргея Міронавіча Кірава: «То, что отцы не допели — мы допоем, то, что отцы не достроили — мы достроим». Чамусьці добрая траціна піянераў увесь час гарлала не «достроим», а «доделаем», і атрымлівалася такая бадзёрая жыццярадасная какафонія, што нават настаўнікі ледзь стрымлівалі ўсмешкі.

Але галоўным было, безумоўна, само вогнішча, якое старэйшыя хлопцы рыхтавалі загадзя — гэткі высокі «шалаш» з жэрдак і сухога галля. Яго запальванне было таксама своеасаблівым рытуалам, і калі полымя разгаралася і сягала да неба, на душы станавілася неяк урачыста і ўзнёсла. Гэта было сапраўднае свята, якога кожную вясну чакалі з нецярпеннем.

А яшчэ «на кастры» прымалі ў піянеры другакласнікаў, якім да мая споўнілася дзевяць гадоў і якія добра вучыліся (астатнім завязвалі гальштукі ўвосень, ужо ў трэцім класе, у спартыўнай зале, і гэта здавалася сумным і нецікавым). Мне пашчасціла быць сярод выбраных у маі, і ўрачыстую клятву мы давалі пад спевы салаўёў і патрэскванне вогнішча... Але тут, як бывае толькі позняй вясной, невядома адкуль узялася хмара, і праз колькі хвілін лінуў такі дождж! Маланкі, здавалася, лупілі проста пад ногі, гром буркаў над галавой, а мы — і старэйшыя, і меншыя, і настаўнікі з важатымі — несліся стрымгалоў да адзінага месца, дзе можна было схавацца — да дамбы, якая перагароджвала рэчку, робячы з яе возера і выводзячы ў вялізным бетонным тунэлі пад дарогай. Вось у гэты самы тунэль мы і пазасковалі, плюхаючы па калена ў вадзе, слізгаючыся на згладжаных ракой каменьчыках. Стоячы і ледзь не падаючы ў добрай-такі плыні вады, трымаючы над галавой гольфы-басаножкі ў адной руцэ, другой мы бераўліва прыціскалі да грудзей новенькія гальштукі, якім не далі намокнуць...

І ўсё гэта разам было такое шчасце, што і сёння, праз трыццаць гадоў, калі разам з майскай маланкай успыхне ў памяці гэты ўспамін, хораша стане на сэрцы, бы пагладзіла яго мяккая кашэчая лапка. І падобны ўспамін не адзіны. Былі паходы, былі турыстычныя злёты, быў цімураўскі рух. Так, гэта былі рэчы абавязкова-ідэалагічныя, і нашы настаўнікі і піянерважатыя, пэўна, давалі нейкія справаздачы і ставілі нейкія «галачкі». Але для дзяцей яны ўмелі ўсю гэту «абавязалаўку» ператварыць у свята, у падзею, у цікавае спаборніцтва. (Дагэтуль аднавяскоўцы са смехам згадваюць, як «цімураўцы» з нашага класа бабулі Гаркоўскай перацягалі ў сенцы ўсю дрывотню, бабка цэлую зіму па дровы на вуліцу не выходзіла. Ці як вывезлі на спецыяльна дзеля гэтага запрэжаным кані ўсе папяровыя мяшкі з саўгаснага свірана — гэтак мы збіралі макулатуру).

ШТО ў выніку? У выніку школу мы пакідалі амаль роднымі людзьмі, і нават праз трыццаць гадоў, як бы ў каго ні склаўся лёс, хто б кім ні стаў, пры сустрэчы спыняемся і размаўляем — пра справы, пра сям'ю. А не кідаем холадна «прывітанне», спяшаючыся перайсці на другі бок вуліцы.

А яшчэ — і гэта, бадай, самае галоўнае, — словы «Перамога», «Вялікая Айчынная», «Радзіма» і «Бацькаўшчына», незалежна ад адукацыі і пісьменнасці, заўсёды пішам з вялікай літары. Нас так навучылі ў школе і мы так адчуваем. Без сумненняў і без варыянтаў.

Нехта скажа: маўляў, узялася старое ўспамінаць. Час цяпер іншы, дзеці іншыя. Згодна. Але дзеці і сёння застаюцца дзецьмі. Так, каб адцягнуць іх ад манітора камп'ютара, трэба добра пастарацца, прапанаваць ім нешта нашмат цікавейшае, чым жыццё ў віртуальным свеце. Напрыклад, адаптаваць тую самую забытую «Зарніцу» пад сучаснае ўспрыняцце — з казачнымі перашкодамі, з выкарыстаннем тых жа планшэтаў ці смартфонаў для задання па арыенціроўцы. Ці арганізаваць паход — не проста з палаткамі ды рукзакамі, а на пошукі... скажам, слядоў напалеонаўскіх скарбаў. Ці збітага ў час вайны савецкага самалёта... Тут вам і прыгоды, і вывучэнне гісторыі, і выхаванне. Варыянтаў можна прыдумаць безліч, было б жаданне.

ДЗЕЛЯ чаго гэта трэба? Каб словы «Перамога» і «Радзіма» з малой літары не пісалі.

Алена ЛЯЎКОВІЧ

■ Факт

ХТО ЯНЫ, БЕЛАРУСКІЯ САКУНЫ

У Старадарожскім раённым гісторыка-этнаграфічным музеі плануецца аформіць раздзел пастаяннай экспазіцыі «Культура і быт беларуса-сакуна пачатку XX стагоддзя».

Тут будзе створана ўнікальная экспазіцыя, якая спалучыць у сабе элементы прыкладнога мастацтва сакуноў, прадметы побыту і заняткаў, асаблівасці забудовы і народнай архітэктуры. Для папаўнення экспазіцыі плануюцца экспедыцыі ў вёскі Дражна, Шчыткавічы, Ляўкі, Залужжа, дзе пражывалі сакуны. Магчыма, дапамогуць і жыхары Старадарожчыны, у якіх захаваліся прадметы старажытнага побыту.

Для рэалізацыі праекта грант у памеры 100 млн рублёў музею выдзеліў Мінскі абласны выканаўчы камітэт.

Нагадаем, беларусаў-сакуноў назвалі так таму, што канчаткі дзеясловаў яны вымаўлялі на «са»: стаміўса, напіўса. Матэрыяльную і духоўную культуру сакуноў вывучаў прафесар Ісаак Сербаў. У выніку ў 1915 годзе ў Пецярбургу ён выдаў кнігу «Беларусы-сакуны. Кароткі этнаграфічны нарыс». Сакуны насялялі беларускае Палессе, на Міншчыне пражывалі ў Слуцкім, Любанскім, Старадарожскім раёне.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Як дагадзіць са смакам хлеба?

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Наша чытачка з вёскі Леніна Дзяржынскага раёна Ганна Станіславаўна Арцюшэўская паскардзілася на смак хлеба, які дастаўляе да іх аўтакрама.

— Раней з Дзяржынска вазілі чорны хлеб двух відаў: фармавы і подавы кшталту «Нарачанскага». Ён нас цалкам задавальняў. Недзе з месяц таму без папярэджання пачалі вазіць хлеб і батоны з Узды. Той хлеб шэры, есці яго я не магу. Спрабавала дазваніцца ў раён, каб высветліць, чаму аўтакрама пачала вазіць такі нясмачны хлеб, дык мяне толькі пераадрасоўвалі з аднаго нумара на другі. Так адказу я і не атрымала. Цяпер даводзіцца прасіць знаёмых, каб прывезлі з іншых мясцін нармальнага чорнага хлеба. Няўжо на старасці гадоў мы не заслужылі з'есці таго, што нам падабаецца, — у канцы размовы Ганна Станіславаўна ледзьве не расплакалася.

Насамрэч, як расказала нам начальнік гандлёвага аддзела Дзяржынскага раённага спажывецкага таварыства Ларыса Збітнева, у райцэнтры выпякаюць толькі батоны і дробнае печыва кшталту булачак. Чорны хлеб і раней вазілі з Барысава. Цяпер аўтакрама сапраўды забяспечвае ў тым ліку і жыхароў Леніна хлебам з Узды.

— За месяц мы прадаём 16 тон такога хлеба. Ніякіх нараканняў няма, у тым ліку ад жыхароў райцэнтра. Я сама ела яго — нармальны смак. Можа, справа якраз у ім? Як той казаў, дзеду міла, а ўнуку гніла... Я размаўляла з вашай заяўніцай. Яе аргумент: хачу чорны, а не шэры. Зразумейце, ну колькі латкоў з хлебам можа перавезці аўтакрама? Мы не можам зрабіць так, каб яна заязджала на некалькі хлебазаводаў і брала, умоўна кажучы, у кожным месцы па адным-два латкі хлеба розных гатункаў. Заўсёды знойдуцца незадаволеныя спажыўцы, якім, напрыклад, падавай толькі мінскі хлеб, — слушна, на наш погляд, даводзіла аргументы Ларыса Аркадзеўна.

Напрыканцы размовы начальнік гандлёвага аддзела раённага спажывецкага таварыства паведаміла, што на працягу тыдня ў Леніна аўтакрама будзе вазіць хлеб з Клецка. Яго выпякае камбінат кааператыўнай прамысловасці. Павозяць і прыслухаюцца да водгукаў жыхароў. Па цане (а гэтае пытанне таксама закранала ў сваім звароце Ганна Станіславаўна, параўноўваючы кошты на хлебапрадукцыю з Дзяржынска (насамрэч, нагадаем, з Барысава) і Узды), як запэўніла Ларыса Аркадзеўна, клецкі хлеб будзе не даражэйшы за барысаўскі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Будзь у курсе!

ЦЫГАРЭТЫ АДКРЫТА НЕ ВЫКЛАДЗЕШ

З 1 ліпеня адкрытая выкладка тытунёвых вырабаў будзе з'яўляцца парушэннем заканадаўства па рэалізацыі тытунёвых вырабаў і карацца штрафам у памеры ад 20 да 50 базавых велічынь.

Адкрытая выкладка будзе забаронена ў гандлёвых аб'ектах, кіёсках, павільёнах і ў аб'ектах грамадскага харчавання. Гэта было зроблена для таго, каб прыняць з вачэй дзяцей, падлеткаў і моладзі цыгарэты. Але курцы змогуць без праблем знайсці свой тавар. Гандлёвыя аб'екты вывесяць пералік тытунёвых вырабаў, якія маюцца ў продажы. Гэта будзе аркуш паперы фармату А4, электронны або любы іншы сучасны носьбіт інфармацыі. Літары будуць аднолькавага памеру, шрыфту, чорнага колеру на белым фоне, без якіх-небудзь графічных рысункаў, малюнкаў і фотаздымкаў, якія б прыцягвалі ўвагу. Пералік будзе змяшчаць найменні наяўных зарэгістраваных таварных знакаў спачатку на рускай, а потым на англійскай мовах у алфавітным парадку. У ім будзе пазначана цана тытунёвага вырабу і краіна паходжання.

Для паляпшэння навігацыі ў гандлёвых залах крам могуць размяшчацца паказальнікі, інфармацыйныя таблічкі, якія будуць накіроўваць спажыўца да месцаў продажу тытунёвых вырабаў.

З 1 ліпеня будуць таксама забаронены вытворчасць, аптовы і рознічны продаж тавараў, якія імітуюць тытунёвыя вырабы. Гэта, напрыклад, флаконы духоў, мыла ў каробцы, якая нагадвае пачак цыгарэт, жавальныя гумкі. Калі электронная цыгарэта будзе імітаваць тытунёвы выраб, то яна таксама будзе забаронена да продажу.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Ну і ну!

СУМКА ЗА 2800 ЕЎРА — УЖО КАНТРАБАНДА

Гэтае сцвярджэнне становіцца правільным, калі тавар не задэкларованы. А грамадзянка Расіі не запоўніла мытную дэкларацыю з абавязковай аплатай пошліны ў спадзяванні, што дарагія пакупкі ўдасца правезці пад выглядам асабістых рэчаў.

У салоне машыны 28-гадовай жыхаркі Маскоўскай вобласці, якая перасякала мяжу на пункце пропуску «Варшаўскі мост», супрацоўнікі мытні заўважылі дзве сумкі. Нават таварныя чэкі былі ў наяўнасці, з якіх вынікала, што адна сумка каштуе 2800 еўра, другая — 3400 еўра. А па правілах бяспошліннага ўвозу асабістай маёмасці яе кошт не павінен перавышаць 1500 еўра. Усё астатняе падлягае дэкларованню з наступнай аплатай падатку.

Яна СВЕТАВА.

СЕРЫЯ КРАДЗЯЖОЎ У ПАЛІКЛІНІЦЫ

У Фрунзенскі РУУС сталіцы паступілі тры заявы пра крадзяжы, якія былі здзейсненыя нібы пад капірку.

Усе яны цягам апошняга часу адбыліся ў адным і тым жа месцы — у паліклініцы па вуліцы Сухараўскай. Схема ва ўсіх выпадках была падобнай: пацыент заходзіў у кабінет да ўрача, пакінуўшы рэчы ў калідоры, а калі вяртаўся, не знаходзіў у вопратцы або сумцы кашалька. Супрацоўнікі крымінальнага вышуку высветлілі, што, напрыклад, адзін са скрадзеных партманетаў зламысніца (ёсць відэа з камер назірання), забраўшы з яго грошы, пакінула ў камеры захоўвання крамы ў іншым раёне горада. З другога кашалька, апроч наяўных грошай, была скрадзена і банкаўская картка, прычым побач з ёй знаходзілася і паперка з запісаным пін-кодам.

Сяргей РАСОЛЬКА

Государственное авиационное аварийно-спасательное учреждение «АВИАЦИЯ» МЧС Республики Беларусь

ПРОВОДИТ ПРОЦЕДУРУ ПЕРЕГОВОРОВ
по закупке услуг на текущий ремонт входов и части помещений здания предполётного отдыха.

Информация о проведении процедуры размещена на сайте www.icetrade.by, процедура № 2015-248870.
Контактный телефон: 385 13 86, факс 287 59 55. УНП 190438733

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

Организатор аукциона – РУП «Белтелеком», в лице Брестского филиала, расположенного по адресу: г. Брест, пр. Машерова, 21.

На аукцион выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества, которое представляет собой:

1. КАПИТАЛЬНОЕ СТРОЕНИЕ, ЗДАНИЕ АТС, ПОМЕЩЕНИЯ И ВСПОМОГАТЕЛЬНЫЕ ПОМЕЩЕНИЯ на 1-м этаже, по адресу: Брестская область, г. Брест, пр-т Партизанский, 4, площадью 119,9 кв.м. Помещения обеспечены инженерными коммуникациями.

Срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи права – 29,975 базовой арендной величины, размер задатка – 2,9975 базовой арендной величины, согласно п.8.2 Положения о порядке определения размера арендной платы, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 №150, установить коэффициент – 3,0; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

2. Аукцион состоится 30 июня 2015 года по адресу: 224030, г. Брест, пр. Машерова, 21 в малой студии Брестского филиала РУП «Белтелеком» в 14.00.

Документы на участие в аукционе по объекту: г. Брест, пр-т Партизанский, 4 принимаются с «22» июня 2015 года по «26» июня 2015 года в рабочее время с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 224030, г. Брест, пр. Машерова, 21, каб. № 416.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049.

Для участия в аукционе участник аукциона в срок, установленный для приема документов:

- перечисляет задаток на с/сч 3012100110001 филиал №100 Брестское областное управление АСБ «Беларусбанк», МФО 246, УНП 201003265;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

